Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 23 1933 г. ЧАЦВЕР № 258 (4802)

Год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ДЭЛЕГАЦЫЯ КАЛГАСНІКАЎ АДЭСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА ПРЫЁМЕ У т. т. СТАЛІНА, КАЛІНІНА, МОЛАТАВА І КАГАНОВІЧА

МАСКВА, 22. (БЕЛТА). 20 лістапада наведала Т. Т. **СТАЛІНА, МОЛАТАВА, КАЛІНІНА, КАГАНОВІЧА** дэлегацыя адэскіх калгаснікаў. Дэлегацыя ўручыла тав. **СТАЛІНУ** рапарт аб сканчэнні збожжа-здачы і азімай сяўбы. Дэлегацыя складалася з лепшых калгаснікаў-ударнікаў і ударніц, выбраных другім з'ездам калгаснікаў-ударнікаў адэсчыны. У яе складзе: **ЧАРНАУСАЎ П. С., БАБАЛІЧ А. С., ЦЯЛЯТНІКАЎ Я. І., ГАЛОТА А. І., КОСТЭНКА А. К., МІШУГЛІ П. І., КРАЎЧЫНА А. П., ПІСЛЮЧЭНКА М. Я., РУПЕРТ Л. Ф.** Дэлегацыю ўзначальвае начальнік палітаддзела ХАШЧЭВАЦКАЙ МТС тав. **СТАХОВІЧ.**

Сяброўская жвавая гутарка з калгаснікамі цягнулася 3 гадзіны. Таварышы калгаснікі расказалі тав. Сталіну, якіх поспехаў яны дабіліся, якія вялізарныя даходы яны атрымалі ў гэтым годзе. Сярод дэлегатаў есць такія ўдарнікі, як Чарнаусаў Пётр Сідаравіч, выпрацаваўшы з сваёй сям'ёй 1110 працадзён, а на кожны працадзень у калгасе тав. Чарнаусава прыходзіцца 17 клгр. збожжа.

Т. Т. Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч падрабязна цікавіліся развіццём жывёлагадоўлі ў калгасах, ростам маладняка, хатняй птушкі і адзначылі, што з пытаннем аб забеспячэнні каровай усіх бескароўных калгаснікаў трэба пакончыць у найкарацейшы тэрмін.

Калгаснікі адказалі, што гэта справа ў іх развіваецца і хутка не будзе ў іх больш ні аднаго бескароўнага двара ў калгасах.

Калгаснікі адзначалі вялізарны рост пагрэбнасцей у вёсцы, узрастанне попыта на тавары. Тав. Сталін, указаўшы на план сур'ёзнага пашырэння лёгкай прамысловасці, сказаў, што тавараў шырокага спажывання будзе выпускацца з гэтага часу ўдвая і ўтрая больш.

Тав. Сталін цікавіўся роляй жанчыны ў калгасах, яе ростам і грамадскай актыўнасцю. Калгасніцы — члены дэлегацыі падрабязна яму расказалі аб гэтым і пацвярдзілі, што жанчына ў калгасе стала вялікаю сілаю. Дэлегацыя расказала таксама аб росце новых кадраў кіраўнікоў у калгасах.

На пытанне дэлегацыі — якая ближэйшая задача калгаснікаў, тав. Сталін адказаў, што ближэйшая задача — **працаваць у калгасе сумленна і берагчы калгаснае дабро.** Тав. Сталін падкрэсліў, што калі калгаснікі сапраўды захочуць працаваць і будуць працаваць сумленна, у іх будзе багацце прадуктаў, і ў самы кароткі тэрмін яны стануць заможнымі працаўнікамі.

Гутарка вялася па самых розных пытаннях калгаснага жыцця.

Уходзячы, дэлегаты сказалі: мы ведаем цяпер, што галоўнае—гэта **сумленна, добра працаваць, берагчы калгас, і мы ўсяго дабіёмся, чаго нам трэба.**

— Перадайце, сказаў на развітанне тав. Сталін, калгаснікам і калгаснікам сардэчнае прывітанне і лепшыя пажаданні.

РЭДАКЦЫЯ „КРЕСТЬЯНСКОЙ ГАЗЕТЫ"

ЦК УсеКП(б) ВІТАЕ «КРЕСТЬЯНСКУЮ ГАЗЕТУ» Ў ДЗЕНЬ ЯЕ 10-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ.

ЗА 10 ГОД СВАЁЙ РАБОТЫ «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» БЫЛА ВЕРНЫМ ВАРТАВЫМ ВЯЛІКАЙ СПРАВЫ САЮЗА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.

ЗА 10 ГОД СВАЁЙ РАБОТЫ «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» БЫЛА БАЯВЫМ АКТЫЎНЫМ ПАМОЧНІКАМ ПАРТЫІ Ў БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ КУЛАЦТВА, ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ ВЁСКІ.

Ў БАРАЦЬБЕ ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ ВЁСКІ «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» ВЫХАВАЛА ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ СЕЛЬКОРАЎ.

ЦК УсеКП(б) УПЭЎНЕН, ШТО «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» І Ў ДАЛЕЙШЫМ БУДЗЕ БАЯВОЮ ЗБРОЯЙ ПАРТЫІ Ў ПЕРАВЫХАВАННІ МІЛЬЁННЫХ МАС КАЛГАСНІКАЎ У АКТЫЎНЫХ БУДАЎНІКОЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА.

ЦК УсеКП(б).

ПАДРЫХТУЕМ БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАДРЫ

(ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ПАРТНАРАДЫ ПА КАДРАХ)

«Перад намі стаяць вялізарныя задачы рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, патрабуючыя вялікай колькасці кадраў, здольных аўладаць новай тэхнікай. У сувязі з гэтым праблема кадраў ператварылася ў нас у праблему сапраўды неадкладную».

Гэтыя словы тав. СТАЛІНА, выказаныя ім на XVI з'ездзе нашай партыі, з'яўляюць баявой праграмай дзейнасці для ўсёй партыйнай арганізацыі.

З таго часу ў падрыхтоўцы кадраў пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і тав. Сталіна дасягнуты значныя рэзультаты. Выраслa сетка ВНУ, ВТНУ, тэхнікумаў, курсаў і розных спецыяльных школ. Выраслa сетка прафтэхнічнай асветы на фабрыках, заводах, у саўгасах, калгасах і г. д.

Пастановы аб вышэйшай, сярэдняй і масавай школе ўнеслі карэнныя змены ў самую сістэму падрыхтоўкі кадраў. Яны накіраваны галоўным чынам на тое, каб задаволіць узрослыя патрэбнасці нашай прамысловасці і сельскай гаспадаркі як у колькасных, так і асабліва ў якасных адносінах новымі класава-вытрыманымі, адданымі справе пролетарскай рэвалюцыі, высокападрыхтаванымі спецыялістамі.

У БССР праблема кадраў набывае выключна востры характар. За гэтыя гады мы бязмоўна дабіліся сур'ёзных поспехаў у падрыхтоўцы кадраў для народнай гаспадаркі БССР.

Ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі забяспечыла нечуваны росквіт нацыянальнай па форме і пролетарскай па зместу культуры. Рашуча выкрываючы і выганяючы класава-чужыя, нацдэмаўскія, вялікадзяржаўніцкія элементы і іх саюзнікаў — правых і «левых» апартуністаў, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ужо зараз у сістэме падрыхтоўкі пролетарскіх спецыялістаў атрымала рад буйнейшых перамог. Мы маем бясспрэчны рост ВТНУ, ВНУ, тэхнікумаў, школ фабзавучэ, курсаў, поўную ліквідацыю няпісьменнасці ў БССР.

Але зроблена яшчэ далёка, далёка не ўсё. У падрыхтоўцы кадраў яшчэ ёсць цэлы рад вялікіх прабелаў.

Нарада па падрыхтоўцы кадраў, якая сёння адкрываецца пры ЦК КП(б)Б, мае выключна вялікае значэнне. Перад гэтай нарадай пастаўлена рашаючая задача — распрацаваць такія практычныя мерапрыемствы, якія-б забяспечылі падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі і, з другога боку, вызначыць практычныя шляхі па ліквідацыі тых вялізарных недахопаў у самой сістэме падрыхтоўкі кадраў, якія дагэтуль яшчэ захаваліся і адмоўна ўплываюць на работу.

Сёння мы асабліва хочам падкрэсліць праблему падрыхтоўкі кадраў для патрэб сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. На гэтым участку работы розныя шкодніцкія, нацдэмаўскія, вялікадзяржаўніцкія элементы асабліва пробавалі разгарнуць сваю падрыўную дзейнасць. І, трэба проста сказаць, гэта ім у асобных выпадках удавалася.

Усім вядомы факты шкодніцкай практыкі пры складанні планаў падрыхтоўкі спецыялістаў з боку былога нам. наркамзема Масюкова. Вядомы і такія факты, калі эсэўшчыя нацдэмы ў апарат Наркамасеты пробавалі ў сваіх праграмах працягнуць нацдэмаўскі хлам.

У сельска-гаспадарчых ВНУ шкодніцкія элементы імкнуліся да таго, каб рознага роду махінацыямі звесці якасць падрыхтоўкі спецыялістаў да нуля.

Праходзіўшая партыйная чыстка ў Горацкай с.-г. акадэміі асабліва наглядна паказала, як класава-чужыя, шкодніцкія элементы распрацавалі такія «праграмы» і «планы», якія давалі ўсё, што хочаце, але толькі не веды, патрэбныя для спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Карыстаючыся стратай рэвалюцыйнай пільнасці ў горацкіх кіраўніках, шкоднікі працягвалі пад фальшыва-нацыянальным сцягам у сістэме выкладання права-апартуністычныя прышчэпаўскія, эсэраўскія і інш. варожыя «тэорыі» і «тэорыйкі».

І толькі чыстка партыі і ЦК КП(б)Б выкрыні ўсё гэта контр-рэвалюцыйнае гняздо, задаравілі інстытуты і намецілі рад практычных мерапрыемстваў па рашучаму паляпшэнню работы сельска-гаспадарчых ВНУ.

Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў па сістэме сельскай гаспадаркі ўсё яшчэ застаецца не на вышыні задач. Зараз у БССР ёсць 2 с.-г. ВНУ і 20 тэхнікумаў. Гэта асноўныя крыніцы, адкуль павінны выходзіць кадры агранамаў, жывёлаводаў, эканамістаў і інш. спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

І тут выраслае значэнне профіля кожнай узятай у паасобку навучальнай установы набывае выключна важнае значэнне. Між тым, як правіла, з боку Наркамзема, Наркамсоўгасаў і г. д. дагэтуль яшчэ не распрацаваны выразныя профілі. Больш таго, яшчэ няма стабільных праграм, планаў і г. д.

Камплектаванне навучальных устаноў пастаўлена надзвычай дрэнна. Напрыклад, у 1933 годзе патрэбна было прыняць у 11 с.-г. тэхнікумаў 1.020 чалавек, прынята-ж толькі 50 проц. гэтай колькасці. У цэлым радзе горацкіх інстытутаў зрываецца своячасны пачатак заняткаў, бо няма патрэбнай колькасці слухачоў.

Якасць прынятых у навучальныя ўстановы як у адносінах асветы, так і па сацыяльнай праслойцы застаецца нездавальняючай. Не лепшая справа і з выкладчыцкім складам, сярод якога ёсць частка такіх людзей, якім ні ў якім выпадку нельга даверыць выхаванне моладзі. З другога боку, значнае недаукамплектаванне кафедр па асобных спецыяльнасцях таксама зніжае якасць работы навучальных устаноў.

Мы ўжо не гаворым аб падручніках, у прыватнасці аб стабільных падручніках па важнейшых сельска-гаспадарчых дысцыплінах, выпуск якіх ДВБ фактычна сарвала.

У інстытутах і тэхнікумах наглядзецца значная цямячасць студэнцтва. Асноўнай прычынай гэтага служыць адсутнасць нежнай барацьбы за рашучае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў вучняў.

Вось асноўныя недахопы ў рабоце с.-г. ВНУ і тэхнікумаў.

За такое становішча нясе поўную адказнасць НКЗ, які не забяспечыў чыткага большэвіцкага кіраўніцтва падрыхтоўкай спецыялістаў. Сектар кадраў НКЗ, на чале якога сядзеў яўны апартуніст ПРАКОПЧЫК, не толькі не займаўся гэтымі пытаннямі, а, наадварот, сваёй апартуністычнай бяздзейнасцю, штампоўшчынай і аліпуйшчынай зрываў справу падрыхтоўкі кадраў.

Адпаючым заняком з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў масавых кваліфікацый. Тут, трэба проста сказаць, Наркамзем праявіў поўную бяздзейнасць. Як гэта не дзіўна, але факт, што сродкі, адпускаемыя на падрыхтоўку масавых спецыяльнасцей, у значнай ступені не скарыстоўваліся, а часта ішлі зусім на іншыя патрэбы. Дагэтуль НКЗ не мае выразнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў масавых кваліфікацый.

Што апрача шкоды прыносіць такое становішча!

Гэта-ж факт, што з-за адсутнасці падрыхтаваных спецыялістаў вялікая колькасць с.-г. машын не была ў гэтым годзе поўнасцю скарыстана. Яркім прыкладам гэтаму може служыць скарыстанне ільнацерабілкі «Комсамолка». Там, дзе былі спецыялісты, дзе партыйная ячэйка ўзялася за справу, там ільнацерабілка працавала. А ва многіх калгасах, дзе гэтага не было, машыны пад страхой прастойвалі самы гарачы час. Такое-ж становішча і з бульбакапалкай і з іншымі складанымі і поўнасцяннымі машынамі.

А калі ўзяць сістэму падрыхтоўкі брыгадзіраў, рахуноводаў, старшынь калгасаў і г. д., дык і тут ёсць значныя хібы. Мы не памыляемся, калі заявім, што ў гэтым пытанні пануе яшчэ саматужніцтва. Няма выразна распрацаванай адзінай сістэмы падрыхтоўкі гэтай катэгорыі кадраў.

Усё гэта ставіць задачу карэннага паляпшэння сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў, пачынаючы ад агранома і канчаючы кіраўніком звяна ў калгасе.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб працы Наркамзема с.-г. інстытута, пастанова ЦК КП(б)Б аб горацкіх с.-г. ВНУ з'яўляюцца баявым кіраўніцтвам для ўсіх партыйных арганізацый.

Наркамзем абавязан па-большэвіцку павярнуцца тварам да кадраў. Не дэкларацыямі і заклінаннямі, не бездапаможным крыкам (аб адсутнасці кадраў), а ўпартай крапатлівай работай НКЗ і партарганізацыі ВНУ і тэхнікумаў павінны падрыхтоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў. Трэба раз і назаўсёды пакончыць з такім саматужніцтвам, якое яшчэ пануе ў падрыхтоўцы кадраў.

Кожная ВНУ, тэхнікум, школа і г. д. павінны мець выразна акрэсленыя профілі, стабільныя праграмы, планы і г. д. ДВБ абавязан неадкладна забяспечыць усе навучальныя ўстановы неабходнай літаратурай.

Таксама і з падрыхтоўкай спецыялістаў масавых прафесій. Пачынаючы ад НКЗ і канчаючы нізавым партыйным і совецкім заняком, трэба перабудаваць сістэму работы ў гэтай галіне. Рашуча выпучаючы на кіруючыя работы адданы партыі і совецкай уладзе актыў мы павінны разам з тым дапамагчы гэтаму актыву асвоіць суму пытанняў, пастаўленую сучасным моментам.

Давяраючы совецкую машыну толькі нашым класава праверным людзям, трэба дапамагчы ім асвоіць гэту тэхніку. А гэта можна зрабіць толькі шляхам планамернай арганізацыі ўсёй сістэмы асветы, пачынаючы ад тэхнічнага гуртка і канчаючы с.-г. ВНУ.

Няма сумнення ў тым, што нарада выключыць рад практычных мерапрыемстваў па рашучым выкананні гэтых недахопаў, па паляпшэнні ўсёй работы ў падрыхтоўцы кадраў совецкіх спецыялістаў.

Першачарговым абавязкам як Наркамзема, так і інш. арганізацый з'яўляецца работа па рашучай перабудове формы і метадаў падрыхтоўкі совецкіх спецыялістаў.

25 лістапада г. г. у 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома Комуністычнай асветы (на вул. К. Маркса) **адбудзецца аб'яднанае пасяджэнне прэзідыума ЦКК КП(б)Б, калегіі НК-РСІ і калегіі Народнага Камісарыята Юстыцыі БССР па пытаннях барацьбы за рэвалюцыйную законнасць на даным этапе.**

З дакладам выступіць наркамюст і пракурор рэспублікі т. КУЗМІН.

Запрашаюцца: старшыні і члены вытворча-таварыскіх судоў, групы сядзейнасці РСІ і пракуратуры, народныя засядацелі, члены секцый рэвалюцыйнасці гарсовета, навуковыя працаўнікі ІСБП Акадэміі навук, практычныя працаўнікі, студэнты і выкладчыкі інстытута совецкага права.

Уваход вольны.

ДАЛЕЙШЫЯ ВОДГУКІ СУСВЕТНАЙ ПРЭСЫ НА УСТАНАЎЛЕННЕ НАРМАЛЬНЫХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ СССР І ПАЗШ

ПАЎПРЭД СССР у ПАЗШ т. А. ТРАЯНОЎСКІ.

Пасол ПАЗШ у СССР БУЛЛІТ

АМЕРЫКАНСКАЯ ПРЭСА АБ НАЗНАЧЭННІ ТАВ. ТРАЯНОЎСКАГА

Н'Ю-ЮРК. (БЕЛТА).

Вашынгтонскія карэспандэнты газет жвава каментуюць назначэнне на пост пасла СССР у ПАЗШ тав. **Траяноўскага** і хуткую згоду міністэрства замежных спраў на гэта назначэнне.

Карэспандэнт **«ГЕРАЛЬД ТРЫБЮН»** піша:

«Траяноўскі, як відаць, буйнейшы совецкі знаўца Японіі. Совецкі ўрад такім чынам падкрэслівае ў адпаведнасці з лістамі Калініна, Рузвельта і Літвінава свае надзеі на захаванне міра. Супольнасць інтарэсаў абодвух краін у справе захавання міра на Далёкім Усходзе, у сардэчнай атмасферы, акружаўшай перагаворы паміж Рузвельтам і Літвінавым, хутка ператварылася ў элемент больш важны, чым галдаль».

Карэспандэнт **«ВАШЫНГТОН ПОСТ»** Фосс піша:

«Назначэнне Траяноўскага — новае сведчанне таго, што захаванне міра было на першым плане ў свядомасці ўдзельнікаў перагавораў».

ГЕРОІ АРКТЫКІ ВІТАЮЦЬ М. М. ЛІТВІНАВА

ВАШЫНГТОН, 21 лістапада (БЕЛТА).

Начальнік совецкай арктычнай экспедыцыі праф. **ШМІДТ** звярнуўся да Літвінава з наступнай радыёграмай:

«Совецкая арктычная экспедыцыя, якая следуе на параходзе «Чэлюскін» з Ленінграда праз Паўночнае мора ў Владівасток і знаходзіцца ў сучасны момант у Берынгавай пратоцы, даведаўшыся аб адпаўленні прыцельскіх дыпламатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ, горача вітае Вас з дасягнутым поспехам. Увесь склад экспедыцыі — як каманда, так і навуковыя работнікі — спадзяюцца, што створаныя ўзаемаадносіны паміж абодвума краінамі свае вынікам будуць мець развіццё супрацоўніцтва ў галіне навуковых даследаванняў.

ШМІДТ».

ЛІТВІНАЎ адказаў на гэту радыёграму наступнае:

«Дзякую і прашу прыняць і перадаць членам экспедыцыі і камандзе гарачае прывітанне і пажаданне поспеха ў геранчным пачынанні, за якім увесь свет сочыць з найвялікшай цікавасцю і захапленнем».

ЛІТВІНАЎ».

АМЕРЫКАНСКІ ПАВЕТРАНЫ ШАР ПАДНЯЎСЯ Ў СТРАТАСФЕРУ

ДАСЯГНУТА ВЫШЫНЯ Ў 17.400 МЕТРАЎ

ПРЫВІТАННЕ М. М. ЛІТВІНАВА ЎДЗЕЛЬНІКАМ ПАЛЁТА

Н'Ю-ЮРК, 21 лістапада (БЕЛТА).

Паветраны шар, які падняўся ў стратасферу ў Акроне (штат Агайо) і дасягнуў вышыні ў 17.400 м., прыземліўся ў раёне Брыдгпуча (штат Н'ю-Джэрсі).

***

ВАШЫНГТОН, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Тав. Літвінаў звярнуўся да морскага афіцэра Сетля і маёра Фордні, зробіўшым пад'ём у стратасферу, з наступнай тэлеграмай:

«САРДЭЧНА ВІТАЮ ВАС З ВАШЫМ ВЯЛІКІМ ДАСЯГНЕННЕМ. Я ЎПЭЎНЕН, ШТО ВАШЫ КАЛЕГІ Ў СОВЕЦКІМ САЮЗЕ З НАЙВЯЛІКШАЙ ЦІКАВАСЦЮ САЧЫЛІ ЗА ВАШЫМ ПАЛЁТАМ.

ЖАДАЮ АБОДВУМ КРАІНАМ ДАСЯГАЦЬ ВЯРШЫНІ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ НАВУКІ І ТЭХНІКІ».

ГЕРАІЧНАЯ БАРАЦЬБА ЧЭХАСЛАВАЦКІХ ПРОЛЕТАРЫЯЎ ЗА АБАРОНУ ПАДПОЛЬНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПРЭСЫ

ПРАГА, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Рабочыя каменяломняў у Ужгорадзе (папоўны горад Закарпацкай Украіны) прынялі забастоўку пратэста супроць забароны комуністычнага друку і ўвядзення выключных законаў.

У Верэцках канферэнцыя 80 прадстаў нікоў вакольных сёл заклікала рашучы пратэст супроць праследаванняў компартыі.

У Берагове да пратэста супроць праследаванняў компартыі далучыліся сацыял-дэмакратычныя рабочыя саюза дрэваапрацоўшчыкаў. На сходзе група рабочых у знак пратэста супроць палітычных сваіх правадыроў залезла ад пераходзе да чырвоных прафсаюзаў. Па ўсяму Закарпаццю прахадзяць паспяховы зборы ў фонд комуністычнага друку.

Згодна паведамленням паліцыі, у Брно на заводах распаўсюджваюцца нелегальныя комуністычныя сатырычныя журналы: «Біч» і «Карабач». Усе вобыскі ў пошуках нелегальнай друкарні не прывялі ні да якіх рэзультатаў.

У цэнтры абутковай прамысловасці Чэхаславакіі ў масавым тыражы распаўсюджваюцца нелегальныя газеты «Руда фронта» і «Слоевчка».

Анапагічныя паліцэйскія паведамленні прыходзяць таксама з іншых месц Чэхаславакіі. На буйнейшых металургічных заводах у Віткавіцах выходзіць нелегальная рабочая газета «Віткавак».

Другая нелегальная газета выпулена ў Вейскірхене. Нелегальныя газеты і антываенныя адозвы ў вялікай колькасці распаўсюджваюцца ў Брукхе, Брухе і Оберлейтэнсдорфе.

Нарэшце, буржуазны друк паведамляе аб арыштах раду рабочых, прадаваўшых на вуліцах Прагі нелегальнае выданне забароненага цэнтральнага органа компартыі «Руде право». У пагоні за нелегальнай сатырычнай газетай «Ды Пейтычэ» (Кнут) жандармы ноччу акружылі адно з паселішч каля Остравы і зрабілі павальныя вобыскі. На працягу дня ў остраўскім вугляпрамысловым раёне адбылося звыш 100 вобыскаў.

АНГЛІЯ

„СВЕДЧАННЕ РОСТА ПРЭСТЫЖА СССР"

ЛОНДАН. (БЕЛТА).

Орган компартыі «Дэйлі уоркер» указвае, што ўстанаўленне нармальных адносін паміж ПАЗШ і СССР — яркае сведчанне роста міжнароднага значэння і прэстыжа СССР. Газета піша:

«Перамогі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР расселі рэакцыйныя надзеі капіталістаў». Вітаючы поспех палітыкі Совецкага ўрада, газета заклікае англійскіх рабочых узмацніць барацьбу супроць антысовецкай палітыкі англійскага капіталізма.

ЛІТВА

„САМАЯ БУЙНАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ"

КАЎНАС, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Увесь літоўскі друк замяшчае паведамленні аб устанаўленні нармальных адносін паміж СССР і ПАЗШ. Блізкая да ўрада «Дэнтос наўэнос» лічыць совецка-амерыканскую згоду самай буйнай перамогай совецкай дыпламатыі з часу устанаўлення совецкай улады.

ЯПОНІЯ

ПАЗІЦЫЯ ЯПОНСКАГА ЎРАДА

ТОКІО, 20 лістапада. (БЕЛТА).

Каментуючы ўстанаўленне дыпламатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ, агенцтва Дэмпо цусін заяўляе:

«Японскі ўрад лічыць совецка-амерыканскае зближэнне лістарычным фактам, які мае сур'ёзнае значэнне для міжнароднага становішча, але ў сучасны момант няздолен ажаваць непасрэдны ўплыў на палітыку Японіі». Паводле слоў агенцтва, устанаўленне нармальных адносін паміж СССР і Злучанымі Штатамі не выклічэ вялікіх змен у планах Хірота аб адпраўцы місіі «Добрай волі» ў ПАЗШ.

КІТАЙ

„ФАКТ СУСВЕТНАГА ЗНАЧЭННЯ"

БЕЙПІН, 19 лістапада. (БЕЛТА).

Кітайскі друк паўночнага Кітая вітае ўстанаўленне нармальных адносін паміж СССР і ПАЗШ. Газета «Шыцзежыбао» думае, што пры існуючым міжнародным становішчы ПАЗШ і СССР будуць, мабыць, дзейнічаць сумесна ў некаторых пытаннях. Газета «Бейпін кроніклъ» адзначае, што факт зближэння паміж СССР і ПАЗШ мае сусветнае значэнне.

ПАЗШ

„ПОСПЕХ СОВЕЦКАЙ ПАЛІТЫКІ МІРА"

Н'Ю-ЮРК, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Друк, па-ранейшаму, жвава абмяркоўвае совецка-амерыканскія адносіны.

«Н'Ю-ЮРК ІВНІНГ ПОСТ» піша:

«Прызнанне Совецкага саюза і пасадка міністра замежных спраў Хэлла ў Монтэвідэо пацвярджае новую палітыку ПАЗШ у адносінах да Азіі і Паўднёвай Амерыкі. Рашэнне перавесці флот з Цихага акіяна з'яўляецца, як відаць, жэстам прымірэння ў адносінах да Японіі, якая глядзіць коса на совецка-амерыканскае супрацоўніцтва».

Пераважная большасць правінцыяльных газет правільнае каментаваць у спачувальным духу ўстанаўленне адносін паміж СССР і ПАЗШ. **«ДЖОРНЭЛЬ»** (горад Джэрсі, штат Н'ю-Джэрсі) указвае, што ўстанаўленне адносін «спрыяе міру і працвітанню».

Многія іншыя правінцыяльныя газеты каментуюць совецка-амерыканскія адносіны ў падобным-жа духу.

Берлінскі карэспандэнт Херота фон-Вігаід піша:

«Адпаўленне традыцыйнай дружбы паміж Амерыкай і Расіяй адсунула на задні план усе іншыя весткі ў Еўропе. У дыпламатычных і ваенных колах лічаць, што прызнанне СССР Злучанымі Штатамі спрыяе міру і устойлівасці становішча на Далёкім Усходзе, абмяжуе арэсіўныя імкненні японскіх мілітарыстаў і на меншай меры эатэрміцце японска-совецкую сутычку. Неафіцыяльная нацыянал-соцыялістаў адлюстроўвае іх здзіўленне і нездавальненне».

Орган компартыі **«ДЭЙЛІ УОРКЕР»** піша:

«Усякі амерыканскі рабочы будзе з радасцю вітаць гэту перамогу барацьбы працоўных. Не гледзячы на скаргі капіталістычнага друку, рабочыя інстынктыўна будуць разглядаць прызнанне, як спецыяльнае перамогі Совецкага саюза і паспяховага развіцця соцыялістычнага будаўніцтва і совецкай палітыкі міра. Рабочыя супаставяць гэтыя поспехі рабочых і сялян СССР са сваім нязменным становішчам — з бесправеццем, голадам і іншымі пакутамі». Паводле слоў газеты, Рузвельт устанавіў адносіны з СССР таму, што яго спробы затрымаць пагыблянне крызіса пацярпелі няўдачу.

«Міжнародныя канферэнцыі, —, піша далей газета, — на якіх імперыялісты хацелі стварыць адзіны фронт супроць Совецкага саюза, таксама пацярпелі крах. У той-жа час націск мас, выступаючых за прызнанне, узмацняўся. Устанаўленне адносін стала магчымым, гэта кучоча моцнаму і блескучаму кіраўніцтву компартыі СССР».

РАЗГУЛ ТЭРОРА У ЯПОНІІ

ТОКІО, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Газета «Ніці-ніці» паведамляе, што 17-га лістапада арыштаваны 4 салдаты такійскага гарнізона. Салдаты абвінавачваюцца ў распаўсюджванні сярод рабочых ваенных заводаў, а таксама сярод салдат нелегальнай комуністычнай літаратуры, у прыватнасці газет «Чырвоны сцяг», «Прыяцель салдата» і інш.

Арыштаваныя будуць аддаваны ваенному суду. Газета «Ніці-ніці» указвае, што сярод навабранцаў выяўлена шмат асоб, якія прымалі ўдзел у комуністычнай дзейнасці да паступлення на ваенную службу. Прычым звычайна яны прадаўжаюць сваю нелегальную дзейнасць у армії. За апошнія дні, паводле слоў газеты, пад суд адданы яшчэ пакалькі салдат.

***

ТОКІО, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Следам за арыштам 13-га верасня ў Токіо 17 адвакатаў, якія займаюцца абаронай абвінавачаных у палітычных працэсах, 17-га лістапада ў Осака арыштаваны 3 адвакаты, а ў Нагове — 1.

Арыштаваныя абвінавачваюцца ў тым, што яны праводзілі абарону па заданнях компартыі.

ТОКІО. (БЕЛТА).

Апублікавана частка вестак аб масавых арыштах рабочых у Токіо, абвінавачаных у кіраўніцтве і ўдзеле ў рабоце революцыйных прафарганізацый, якія ўваходзяць у кіруючае компартыйнай прафаб'яднанне «Кіогікай».

З лютага па кастрычнік уключна адной толькі сталічнай паліцыяй арыштавана 1.696 рабочых, у тым ліку 68 жанчын. Пракуратуры перададзены пазуль толькі 14.

Наперакор масавым арыштам, «Кіогікай» правяло рад кампаній пад лозунгамі: «Барацьба супроць імперыялістычнай вайны», «Абарона СССР», «Поўная незалежнасць Карэі і Фармозы» і г. д.

Сярод арыштаваных кіраўнікоў «Кіогікай» паліцыя называе старшыню «Кіогікай» Ісігакі, галоўнага сакратара Масубучі, членаў цэнтральнага камітэта «Кіогікай» — Сато, Ісізакі і Нагахоры, жаночага арганізатара Кітазава і іншых.

***

ТОКІО, 20 лістапада. (БЕЛТА).

Гэтымі днямі правесцен рад арыштаў сярод супрацоўнікаў шырокавяшчальнай радыёстанцыі. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў выданні журнала комуністычнага зместа.

АБ ХОДЗЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Пастанова ЦК КП(б)Б па дакладу сакратара лёзненскага РК КП(б)Б т. Міцькова

Не гледзячы на цэлы рад пастаноў і указанняў з боку ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб своячасовым выкананні ўсіх работ па ільнаапрацоўцы і асабліва па ільназагатоўках, лёзненская партыйная арганізацыя не перабудавала сваёй работы такім чынам, каб забяспечыць выкананне гэтых указанняў ЦК.

Партыйныя і асабліва совецкія арганізацыі, а таксама дырэкцыя МТС не зрабілі ўсіх неабходных вывадаў з неаднаразовых папярэджанняў ЦК КП(б)Б аб тым, што цэнтральнай задачай лёзненскай партыйнай арганізацыі з'яўляецца барацьба за лён. Кіраўніцтва абмежавалася толькі дэкларавaннем таго, каб раён зрабіць вядучым у БССР па ільну, не дадмаца ваўны гэтага практычнымі мерапрыемствамі.

Раённыя арганізацыі, паліцаддзел МТС і зараз яшчэ не арганізавалі масавай апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве і не мабілізавалі партыйна-комсамольскую арганізацыю, сельсоветы, калгасны актыў і калгаснікі-ударнікі на большэвіцкую барацьбу за лён. Яны таксама не ўжылі ўсіх вычарпальных мерапрыемстваў, забяспечваючых пасяховае выкананне ільназагатовак, не гледзячы на тое, што іменна ў Лёзненскім раёне больш чым дзе-б там ні было меліся і ёсць да таго ўсе магчымасці і ўмовы (самы магутны і стары на ільнаводству раён Беларусі, наяўнасць кваліфікаваных вопытных калгаснікаў па апрацоўцы і прыёмцы ільну і інш.).

Раённыя арганізацыі не здолелі спалучыць работы па выкананню плана пастаўкі збожжа і бульбы з масавай апрацоўкай ільну і здачай яго дзяржаве, па прычыне чаго гэта важнейшая гаспадарча-палітычная работа ў калгасах была адсунута на больш познія тэрміны.

У розультаце ўсяго гэтага рашаючы ў ільназагатоўках лістапад месяц упушчан, і рад паказальнікаў як па апрацоўцы, так і па загатоўцы ільну на 15 лістапада гэтага года на раёну ніжэй, чым тыя-ж паказальнікі па гэтае-ж чысло мінулага года.

ЦК адзначае, што ўскрытыя факты і стан работы з апрацоўкай і загатоўкай у Лёзненскім раёне ільну адносяцца адноўкава і да другіх раёнаў ільнаводства.

ЦК КП(б)Б патрабуе ад лёзненскага партыйнага і асабліва совецкага кіраўніцтва, а таксама МТС безумоўнага стопроцантнага выканання да ўстаноўленага тэрміна плана загатовак ільнавалакна і ільнасеяння як па колькасці, так і асабліва па якасці, зрабіўшы гэту задачу на практыцы баявой, цэнтральнай задачай усёй партыйнай і комсамольскай арганізацый, паліцаддзела МТС, сельсоветаў і калгасаў.

ЦК прапануе райкому КП(б)Б, РВК і паліцаддзелу МТС неадкладна мабілізаваць усе сілы партыйна-комсамольскай арганізацыі, сельсоветаў, калгаснага актыва, калгаснікаў-майстроў ільдаводства і кваліфікаваных ільнатрапальшчыц, калгаснікаў-ударнікаў на масавую апрацоўку ільну і на выкананне кожным калгасам і аднаасобнай гаспадаркай планаў ільназагатовак, выкрываючы кулацкі сабатаж і спробы класавага ворага сарваць апрацоўку і загатоўкі ільну.

Неабходна разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва сельсоветаў, лучэк калгасаў і калгаснікаў-ільнатрапальшчыц на лепшую апрацоўку ільну і на выкананне кожным калгасам і аднаасобнікам устаноўленага для яго сярэдняга нумара ільнавалакна, арганізаваўшы шырокі паказ работы лепшых ільнатрапальшчыц і перадавых калгасаў і аднаасобнікаў, выканаўшых планы ільназагатовак устаноўленай якасці.

ЦК прапану

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПАРТЫЙНА-КОМСАМОЛЬСКУЮ ВУЧОБУ—НА ЎЗРОВЕНЬ СУЧАСНЫХ ЗАДАЧ

Забяспечыць усе школы і гурткі добраякаснымі прапагандыстамі

Шырэй фронт спаборніцтва!

(На радыёнарадзе па партвучобе)

Першым атрымаў слова Гомель. Ля мікрафона загалчык культпропа гаркома партыі тав. Яцкевіч. Без малейшай вамінкі адчэшваў ён лічбы, характарызуючыя ахоп партпалітвучобай кожнага вёстаў, комсамольцаў і беспартыйных актыву. Слухаеш і думаеш: «Відаць, людзі папрацавалі». Вакол усё добра: школы, гурткі, семінары арганізаваны, комуністы побачаць ахоплены вучобай, праграмы выканаў хоць адбаўлай.

Аднак, гэта мысль хутка змяняецца. Пры пераходзе да характарыстыкі стана самой вучобы тав. Яцкевіч ужо не ўжываў слова «добра». Яно ўступіла месца словам: «недзвазьняюча», «слаба», «невыстарчальна».

Аказваецца, арганізаваць школы і гурткі арганізавалі, а падручнікамі, чаргавымі дапамогамі, пазнічаннямі забяспечылі далёка не ўсе. Нават у камсамольскіх школах не ўсе слухачы маюць падручнік Інгулава. На добрушскай фабрыцы «Герой працы», напрыклад, адным падручнікам прыходзіцца карыстацца 3-5 таварышам. На Гомсель машы тры партыйнадыцкіх школы і адна комсамольская палітшкола не маюць дзе праводзіць заняткі, бо з Дома Комсаветы іх далёкана паграсілі, а другога памяшкання не далі.

Тое-ж самае і з прапагандыстамі. Па колькасці іх, асабліва ў горадзе, хапае. Але па якасці вельмі многія не адпавядаюць сваёму прызначэнню. Аб гэтым сведчыць факт адхілення ад выкладання ў вышэйшых школах шэсці чалавек. Праўда, тав. Яцкевіч гэты факт уцюбае ў заслугу культпропа, які на яго думцы не дрэнна арганізаваў работу па праверцы якасці выкладання ў школах. Адказ, не пазбягае сумненню, што падбор прапагандыстаў культпропам праведзен недаволі сур'ёзна. Усяго, напрыклад, прапагандыста тав. Фейгіна. Ён на адных з заняткаў камсамольскай школы гаварыў проста глупства. Па яго думцы «у пачатку 90-х гадоў у Расіі з'явіўся мандат рэвалюцыя пар Барокінтэйн». Гэты-ж самы Фейгін характарызаваў газету «Искра» толькі як агітатара за необходнасць стварэння партыі.

Як на адзін з буйных недахопаў вучобы, необходна ўпакаць на адсутнасць кантролю за падрыхтоўкай прапагандыстаў да заняткаў. Вельмі многія прыходзяць праводзіць заняткі без канспектаў і рабочых планаў. Праўда, загалчык культпропаў парміалектыкаў і ячэек на гэта ім указваюць, але яны не зварачаюць увагі і працягваюць сваю сурэку. Вось такі ў Гомелі «вядомы» прапагандыст т. Гудоў. Ён лічыць, што для яго, скончыўшага комвуз, рыхтаванна да заняткаў няма неабходнасці. Між тым прыходзіць у школу і часта блытаецца. Аб гэтым ведаюць у культпропе гаркома партыі, але рашучых мер да тав. Гудова, як халтурщыка і зрыўшчыка якасці партыйнай вучобы, не прымаюць.

Вельмі дрэнна стоіць справа з арганізацыяй парткомсамольскай вучобы ў вёсках Гомельшчыны. Там па сутнасці вучоба яшчэ не выйшла са стадыі арганізацыйнага аформлення. Фармальна на паперы кандыдацкія школы і перпрапачаткавыя гурткі па ленінізму арганізаваны пры кожнай буйнай калгаснай ячэйцы і пры асобных партыйных групах. Але заняткі ў большасці гэтых школ і гурткоў яшчэ не пачаліся: няма падручнікаў, не хапае прапагандыстаў, слухачы на прыходзяць на заняткі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што гомельская партыйная арганізацыя яшчэ слаба мабілізавалася на замацаванне вынікаў чысткі ў частцы большэвіцкага разгортвання партыйнай вучобы, марксіцка - ленінскага выхавання комуністаў, асабліва маладых, палітычна малаграмотных. Гэта сведчыць таксама і аб тым, што культпропу таркома партыі слаба выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы па спаборніцтву з Віцебскам у барацьбе за пераходны сцяг «Звязды». Гэты прабел партарганізацыі Гомельшчыны павінна ва што-б там ні стала ліквідаваць, тым больш што магчымасці для большэвіцкага разгортвання вучобы на ўмовах Гомельшчыны вельмі вялікія.

Такое-ж становішча з партыйна-комсамольскай вучобай і ў Віцебскім раёне. Там таксама яшчэ не разгарнулася па-сапраўднаму барацьба за выкананне самаабавязацельстваў, узятых па дагавору, заключанаму з Гомельшчынай.

Праўда, на радыёнарадзе зак. культпропа таркома партыі тав. Зінсўў пры водзіў як быццам і не дрэнныя лічбы. Члены партыі ахоплены партыйнай вучобай на 85 проц., кандыдаты — на 82 проц., спачуваючыя — на 74 проц. Але гэта толькі фармальна, на паперы, бо павесванне заняткаў у середнім ледзь дасягае 75 проц., а ў некаторых партыйных калектывах (шчэ менш. На фабрыцы «Профінтэрн», напрыклад, заняткі наведваюць толькі 68 проц. зарэгістраваных слухачоў. З пасборам прапагандыстаў справа таксама стаіць нізка. Усіх прапагандыстаў па раёну —109 чал. З іх толькі 35 прагуцчаны праз гарадскую праверачную камісію. А астатнія назначаны неправеранымі. Тэму і не дзіва, што некаторыя з іх, напрыклад, тав. Халодная з фабрыкі імя Клары Цэткін, на заўтра пасля заняткаў не можа адказаць, якую тэму яна прапрацоўвала ў школе ўчора. А на фанерным белым адзін з прапагандыстаў лоўка запэўніў слухачоў, што газета «Искра» з'явілася на многа раней, чым група «Вызвалення працы».

Так стаіць справа ў горадзе. Што-ж датычыць вёскі, то там партыйная вучоба фактычна яшчэ не пачалася. На радыёнарадзе тав. Міхейчык больш гаварыў аб тым, што намечана арабіць, бо фактычна ні адна партыйная калгаспая ячэйка да заняткаў у школах яшчэ не прыступіла. Першыя дні вучобы амаль усюды сарваны, бо многія комуністы не з'явіліся на заняткі: былі заняты другой работай.

Незабяспечаны ўласковыя кандыдацкія школы падручнікамі, спытамі і лічыт прапагандыстамі. Трэба адзначыць, што культпропу таркома партыі мала дапамагае палітадыцелу ў гэтай частцы. Ён абмежаваўся выдзяленнем толькі аднаго прапагандыста. Такое-ж канцтоўнае пачуванне, як вылучэнне прапагандыстаў па лініі нафсёна прадпрыемстваў над калгасамі, культпропам не пакоплена. А зрабіць гэта неабходна, інакш палітадыцелу прыдзецца сустрэцца з вялікімі цруднасцямі.

Гомель і Віцебск — абодва буйныя прамысловыя цэнтры Беларусі. У іх ёсць усе магчымасці быць у першых радах барацьбітоў за пераходны сцяг «Звязды». І задача партыйных арганізацый — дабіцца гэтага ва што-б там ні стала.

***

Лаюля Гомеля і Віцебска слова для інфармацыі аб становішчы партыйна-комсамольскай вучобы было дана Магілеву і Барысаву, якія спаборнічаюць паміж сабой. У абмеркаванне ад першых двух іх інфармацыі былі больш канкрэтныя, насычаныя фактамі становішча работы кандыдацкіх школ, марксіцка-ленінскіх гурткоў.

Адзіны з такіх становішчы вопытаў у рабоце гэтых двух партыйных арганізацый па разгортванню партыйнай вучобы, в'яўляецца заклік слухачоў ва ўдарнікі вучобы. Ініцыятыва ў гэтым належыць Барысаву. Ён першы высунуў гэту форму работы, разгарнуўшы спаборніцтва паміж школамі і ўнутры іх. Назву і кампрэ ўдарніка вучобы атрымлівае толькі той слухач, хто рэгулярна наведвае заняткі, добра да іх рыхтуецца і ўсвойвае праграму. Але ад начасова да ўдарніка вучобы прад'яўляецца патрабаванне быць ударнікам і ва вытворчасці.

Культпропам райкома праведзена ўжо гарадская канференцыя ўдарнікаў вучобы, у якой прымала ўдзел больш 300 чал. Неабходна адзначыць, што сярод ударнікаў вучобы ёсць вельмі многа опачуваючых, якія пасля чысткі па-базовому ўзяліся за павышэнне свайго палітычнага ўзроўню.

Характэрна, што некаторыя опачуваючыя за два месяцы пасля чысткі, дзякуючы сваёй стараннасці, дабіліся вялікіх поспехаў. Узяць, напрыклад, опачуваючую тав. Казак. Яна за два месяцы вучобы настолькі авалодала пашоўшіць свае палітычныя веды, што раённая камісія па чысткі ў напрамку разгортвання партпалітвучобы многімі ячэйкамі як сельскімі, так і гарадскімі не ажыццяўляюцца.

РК КП(б)Б, у прыватнасці агітпрапаганды аддзел, загалчыкам якога з'яўляецца тав. Мацко, фармальна адносіцца да арганізацыі партпалітшкол, іх камплектавання і вылучэння прапагандыстаў. Падамо некалькі характэрных фактаў. Чэрнеўская ячэйка складаецца з 3 членаў і 2 кандыдатаў партыі. Апрача таго, пры ячэйцы ёсць 7 опачуваючых. І што-ж? Да гэтага часу ячэйка яшчэ не прыступіла да партвучобы.

Або ўзяць Чурылаўскую ячэйку. На запытанне: «Як у вас арганізавана партпалітвучоба?» — кіраўнік школы тав. Магазінніка адказвае: «Мы ўжо даўно займаемся». На справе-ж школа не мае ніякіх падручнікаў і праграмы. Такое-ж становішча і ў ячэйцы друкароў ВПУ. Там арганізован палітгурток, але як ён працуе, відаць хаця-б з наведвання заняткаў. Запісалася 40 слухачоў, а прыходзіць на заняткі больш-менш рэгулярна толькі... 9. Сакратар ячэйкі тав. Лесіцін кажа:

—Мы чакаем, пакуль скончыцца чыстка ўсіх гарадскіх ячэек, а потым ужо возьмемся за наладжанне партпалітвучобы.

М. Б. і Н. П.

Спачуваючых скінулі з рахунка

Пры чысткі Ўшацкай партарганізацыі праверкамі праведзена ў кандыдаты і спачуваючыя каля 40 проц. партарганізацыі. Асноўная пры чына перавода — палітычная неспісь неспасць і партыйная навытрымаласць.

Здавалася-б, што гэта акалічнасць паўінна была-б прымусіць партыйнае кіраўніцтва па-большэвіцку разгарнуць работу па марксіцка-ленінскаму выхаванню кандыдатаў і спачуваючых, акружыць гэтых сацыяльна-блізкіх да партыі людзей клопатамі і ўвагай. Але ў Ўшачах атрымалася наадварот. Там спачуваючых не толькі не акружылі ўвагай, але стварылі ўмовы, спрыяючыя адрыву іх ад партыі.

Вось канкрэтныя факты. У самым цэнтры раёна — Ўшачах у спачуваючыя пераведзена 5 чал. Усе яны сядзяцца спраўляюцца з усклаўзенай на іх работай на ўстановах, дзе яны працуюць. Але пра іх чамусці партыйныя ячэйкі забылі. Забыў і райком партыі. Характэрна, што ўсе гэтыя спачуваючыя нават не прыцягнуты да партыйнай вучобы ў кандыдацкую школу. Між тым жаданне вучыцца ў іх вельмі вялікае. Яны самі прышлі да прапагандыста кандыдацкай школы тав. Базылевіча і папрасілі, каб ён уключыў іх у спіс слухачоў.

Але мудрае «начальства» з культпропа райкома партыі прапагандыст тав. Натарыус палічыў гэта адступленнем ад «прынцыпаў» марксіцка-ленінскай вучобы і аддаў проста за лад: «Спачуваючых са спіса слухачоў школы выкрэсліць».

І няма нічога дзіўнага, калі спачуваючыя зараз заяўляюць:

— За што-ж нас перавялі ў спачуваючыя? Мы хочам вучыцца, каб узняць свой палітычны ўзровень і зноў вярнуцца ў партыю, а нас выключаюць са спісаў слухачоў кандыдацкай школы.

Такіх фактаў аднадзейных адносін да пераведзеных у спачуваючыя ў Ўшацкім раёне можна знайсці шмат. Аб чым яны гавораць? Перш за ўсё аб тым, што райкам партыі яшчэ не разгарнуў большэвіцкай работы па замацаванню рэзультатаў чысткі ў частцы арганізацыі партыйнай вучобы наогул і асабліва сярод спачуваючых.

Сп.

Урокі мінулага нічаму не навучылі

Чысткі партарганізацыі Горацкага раёна паказала, што значная частка членаў і кандыдатаў партыі палітычна малаграмотная Чаму? Таму, што ў мінулым годзе палітвучоба ў пераважнай большасці партячэек была сарвана.

Аднак, урокі мінулага нічаму не навучылі райпартыкіраўніцтва. У гэтым годзе, як і летась, партвучоба знаходзіцца пад пагрозай зрыва. Прыняты камісіі па чысткі ў напрамку разгортвання партпалітвучобы многімі ячэйкамі як сельскімі, так і гарадскімі не ажыццяўляюцца.

РК КП(б)Б, у прыватнасці агітпрапаганды аддзел, загалчыкам якога з'яўляецца тав. Мацко, фармальна адносіцца да арганізацыі партпалітшкол, іх камплектавання і вылучэння прапагандыстаў. Падамо некалькі характэрных фактаў. Чэрнеўская ячэйка складаецца з 3 членаў і 2 кандыдатаў партыі. Апрача таго, пры ячэйцы ёсць 7 опачуваючых. І што-ж? Да гэтага часу ячэйка яшчэ не прыступіла да партвучобы.

Або ўзяць Чурылаўскую ячэйку. На запытанне: «Як у вас арганізавана партпалітвучоба?» — кіраўнік школы тав. Магазінніка адказвае: «Мы ўжо даўно займаемся». На справе-ж школа не мае ніякіх падручнікаў і праграмы. Такое-ж становішча і ў ячэйцы друкароў ВПУ. Там арганізован палітгурток, але як ён працуе, відаць хаця-б з наведвання заняткаў. Запісалася 40 слухачоў, а прыходзіць на заняткі больш-менш рэгулярна толькі... 9. Сакратар ячэйкі тав. Лесіцін кажа:

—Мы чакаем, пакуль скончыцца чыстка ўсіх гарадскіх ячэек, а потым ужо возьмемся за наладжанне партпалітвучобы.

М. Б. і Н. П.

П. ПАСЮКЕВІЧ

Старшыня камісіі па чысткі Віцебскай партарганізацыі

НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ*)

Займаючыся пытаннямі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і дасягнуўшы ў гэтай рабоце вялікарных поспехаў, гарадскі камітэт партыі, у асаблівасці гарсавет, упускаў яшчэ не заняліся радам кардынальных пытанняў, без вырашэння якіх справа арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў не можа мець рашаючых поспехаў. Гутарка ідзе аб улічу зямельных плошчаў і аб афармленні зямлеўпарадкавання калгасаў і адпасобнікаў. Становішча з зямлеўпарадкаваннем і ўлікам зямельных плошчаў у Віцебскім раёне стаіць надзвычай дрэнна. Пры службе вясной гэтага года мела месца такое з'явішча, калі ў плошчу засева былі ўключаны вазёры і аўна непрыгодная зямля. Адсутнасць зямлеўпарадкавання ў калгасах прывяла да таго, што многія калгаснікі надзелены прысядзібнымі ўчасткамі вышэй нормы (Рудакоўскі сельсавет і інш.). Дагэтуль няма дакладнай праверкі гэтых фактаў.

Адсутнічае масавая работа з адпасобнікамі. Аб гэтым сведчыць факт хода збожжапаставак. У самым пачатку загатовання работы па збожжапастаўках неабходна было звярнуць увагу па адпасобнікаў, якія, як стала відаць потым, запазнілі свае часовае выкананне збожжапаставак. Ва ўмовах Віцебскага раёна, дзе калектывізацыя складае ўсяго 57 проц., забыць пра адпасобнікаў з'яўляецца буйнейшай памылкай.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі калгасных ячэек і ўмацаванне іх невыстарчальна праведзена ў жыцці. Накіраванне на вёску таварышоў з гарадской партарганізацыі несумненна ўмацавала вясковыя ячэйкі. Аднак, праведзеная рэарганізацыя партячэек з тэрытарыяльных у вытворчыя слаба замацавана ў нізавым звяне. У калгасе, у брыгадзе насычанасць комуністамі плачнічная. Есць адзіночкі (члены партыі, асабліва кандыдаты), не ахопленыя ўплывам партарганізацыі, прадастаўленыя самім сабе. (Рудакі, Старое сяло).

У многіх парткалектывах зусім адсутнічае работа з нізавым партыйным, сістэматычная праверка рэалізацыі прапаноў праверкоўцаў. Не праводзіцца дыферэнцыяванае кіраўніцтва асобнымі тыпамі ячэек. Ячэйкі совецкіх устаноў, каапераціўных арганізацый і, асабліва, навучальных устаноў і адміністрацыйных органаў застаюцца ка-за ўвагай гаркома партыі. Аб гэтым сведчыць той факт, што ва многіх з гэтых ячэек арганізацыйная структура зусім не адпавядае аб'ёму і зместу работы. Напрыклад, ячэйка медсанпрацы абслугоўвае звыш 50 устаноў і натуральна, што яна працуе «наогул», не ўваходзячы ў сутнасць работы кожнай установы.

Неабходна ў далейшай рабоце звярнуць асаблівую ўвагу на неабходнасць умацнення масава-растлумачальнай работы па ўсіх галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі і перанясення цэнтра цяжару на выхаванне і перавыхаванне людзей, побач з ужываннем рэпрэсіўных мер у адносінах класава-варожых элементаў. Вялікую работу віцебскай арганізацыі трэба прарабіць у галіне разгортвання крытыкі і самакрытыкі і ўкаўтрыпартыйнай дэмакратыі. Апошняя знаходзіцца ў зусім недапушчальным становішчы. Чыстка выявіла рад фактаў, калі сакратары ячэек не выбіраюцца на агульных сходах, што з'яўляецца парушэннем статута партыі.

Віцебская партыйная арганізацыя пасля ачышчэння сваіх радоў ад усіх непадзейных і няўстойлівых элементаў з'яўляецца баявой палітычнай арганізацыяй, якая па сваіх магчымасцях на праву павінна заняць адно з першых месц ва ўсёй КП(б)Б.

*) Канец. Пачатак гл. у № № 256, 257.

ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ПАРТНАРАДЫ АБ КАДРАХ

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ—БОЛЬШЭВІЦКІ ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫ КАМСКЛАД

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ С.-Г. НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Опескаўскі пленум ЦК КП(б)Б прызнаў работу Наркамзема БССР прыгалінае падрыхтоўкі кадраў і кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі незадавальняючай і абавязаў Наркамзем забяспечыць карэнную перабудову работы з тым, каб у бліжэйшым часе падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для сельскай гаспадаркі.

Важнейшыя ўказанні ЦК КП(б)Б Наркамземам не выкананы. Справа з падрыхтоўкай кадраў і на сёмнішні дзень стаіць зусім незадавальняюча. Аб гэтым сведчыць набор студэнтаў у сельска-гаспадарчыя ВНУ і тэхнікумы. Так, па Горацкаму сельска-гаспадарчаму інстытуту замест 725 прынята 150 чал.; у тэхнікумы замест 1.350 чал. прынята 854.

У чым прычыны такой ганебнай работы сельска-гаспадарчых навучальных устаноў у справе камплектавання? Сектар кадраў НКЗ, узначальваемы Пракопчыкам, апартуністычна адносіцца да справы камплектавання, не кіраваў гэтым важнейшым участкам работы. Дырэктары тэхнікумаў замест камплектавання займаліся парадным шуміхай вакол гэтага пытання (чэрыкаўскі веттэхнікум, дырэктар Казакоў, гарадоцкі тэхнікум механізацыі, дырэктар Мікано).

Пастанова ЦК КП(б)Б на Наркамзему і Трактарацэнтру кіраўніцтвам сектара кадраў НКЗ (Пракопчык, Смірноў) не была ўлічана, у выніку гэтага ў горацкім с.-г. інстытуце на працягу дзўтага часу арудвалі шкоднікі, сведома зрываўшыя справу падрыхтоўкі кадраў для соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Класавыя ворагі накіравалі сваю дзейнасць на стварэнне такіх профіляў, разбітых на вельмі вузкія функцыі з тым, каб тыя, што навучаюцца ў гэтых установах не маглі аўладаць асновамі агульнага зямляробства, апратэхнікі, жывёлагадоўлі і глебазнаўства і не маглі быць скарыстаны на канкрэтных участках сельскай гаспадаркі.

Контр - рэвалюцыйная шкодніцкая работа ў горацкім с.-г. інстытуце аказалася магчымай толькі таму, што партыйныя і совецкія арганізацыі Беларусі, у асаблівасці Наркамзем і партыйнае кіраўніцтва Горацкага раёна не кіравалі адным з важнейшых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва. Не выканалі важнейшага ўказання партыі аб тым, што праблема кадраў з'яўляецца зараз, у абстаноўчы рэканструкцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі — рашаючай праблемай соцыялістычнага будаўніцтва. (З пастановы бюро ЦК).

Чыстка партыі горацкага сельска-гаспадарчага інстытута ўскрыла контр - рэвалюцыйную шкодніцкую работу, накіраваную на зрыў падрыхтоўкі кадраў. Пастанова бюро ЦК па горацкаму інстытуту паставіла рад канкрэтных задач перад партарганізацыямі Беларусі: перад кіраўніцтвам горацкага с.-г. інстытута, РК і Наркамземам па карэннай перабудове работы інстытута, усяшчі класавай пільнасці, з тым, каб у бліжэйшым часе падрыхтаваць спецыялістаў для сельскай гаспадаркі.

Сельска-гаспадарчыя тэхнікумы не забяспечаны навучальнымі і жыллёвымі памяшканнямі. Гомельскі копгадоўчы тэхнікум мае свае аўдыторыі на сцэне і ў фае соўгаснага клуба. Студэнты тэхнікума з-за адсутнасці жыллёвых памяшканняў жывуць на прыватных кватэрах у сялян. У вучэбным корпусе віцебскага тэхнікума па барацьбе са шкоднікамі сельска-гаспадарчых раслін жывуць 10 сем'яў прыватных жыхароў. Не лепш справа з памяшканнямі стаіць у Брагінскім, Клімавіцкім і інш. сельска - гаспадарчых тэхнікумах.

Выкладчыцкі і студэнцкі склад тэхнікумаў засмечан класава-варожымі элементамі. Так, загалчык навучальнай часткі і выкладчык спецдысцыплін гомельскага копгадоўчага тэхнікума з'яўляецца сынам раскулачанага. У брагінскім тэхнікуме выкладчык—кулак. Студэнты Крэйс і Куцэнка ў гарадоцкім тэхнікуме механізацыі вялі агітацыю супроць загатовак. Па праверцы іх соцыяльнага становішча аказалася, што яны абодва з'яўляюцца дзецьмі кулакоў. У брагінскім тэхнікуме выяўлена 5 студэнтаў — дзяцей кулакоў.

Апартуністычная бяздзейнасць у справе арганізацыі работы навучальных устаноў з боку сектара кадраў Наркамзема і ўпаўнаважанага НКСоўгасаў (Пракопчык, Новікаў, Смірноў), адсутнасць большэвіцкай пільнасці, простае ігнараванне пастаноў ЦВК СССР і ЦК УсеКП(б) аб вышэйшай школе і тэхнікумах—вось што характарызуе работу гэтых наркаматаў у галіне падрыхтоўкі с.-г. кадраў.

ПАТАПЕЙКО.

ТЭХНІКУМАМ—ВЫРАЗНЫЯ ПРАГРАМЫ І ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Рашэнне ЦВК аб праграмах і рэжыме ў ВНУ і тэхнікумах, спецыяльная пастанова ЦК УсеКП(б) аб варонежскім с.-г. інстытуце даюць разгорнутую праграму дзеяння ў галіне падрыхтоўкі спецыялістаў і для сельскай гаспадаркі ў прыватнасці.

Па БССР мы маем давоўі шырокую сетку сельска-гаспадарчых навучальных устаноў, вырасшых галоўным чынам за апошні час. Работа сельска-гаспадарчых устаноў, якасць падрыхтоўкі імі спецыялістаў далёка не задавальняюць запатрабаванні.

У сістэме Наркамзема — 17 тэхнікумаў. З іх 14 рэспубліканскіх і тры саюзнага значэння. У тэхнікумах навучаецца каля 3-х тыс. студэнтаў. Якасць рыхтуемых спецыялістаў вырашаюць выразныя праграмы, навучальныя планы і высокакваліфікаваныя выкладчыкі. Як стаіць справа з праграмамі, навучальнымі планамі ў сістэме Наркамзема?

«Праграмы і навучальныя планы атрымліваем з саюзнага Наркамзема, мы іх толькі перапісваем і перасылаем у тэхнікумы. Імі забяспечаны ўсе тэхнікумы», — так заявіў работнік Наркамзема, які абруе тэхнікумамі, тав. Прохарава.

А далей высвятляецца, што мэцісаўскі фінансава-эканамічны тэхнікум працаваў увесь час без усякіх праграм. Для яго толькі на днях пазычылі праграму ў Наркамфіне. Падыходзіць яна ці не падыходзіць да гэтага тэхнікума, работнік Наркамзема не ведае. Праграму па хіміі для аграхімічных тэхнікумаў, разлічаную на 300 гадзін, перапісалі і паслалі ў гідратэхнікум, дзе па навучальнаму плану ўсяго на хімію адведзена 150 гадзін. Так апарылася з усімі праграмамі. Іх накіроўваюць у тэхнікумы без усякага ўліку асаблівасцяй тэхнікума, без усякіх змен, з прыпіскай: «Дапасуйце да вашага навучальнага плана». Такім чынам, фактычна па важнейшых дысцыплінах стабільных праграм няма. Агульнаадукацыйныя дысцыпліны праводзяцца зусім без усякіх праграм.

Прайшло з месяцы з пачатку навучальнага года, а большасць тэхнікумаў працуюць без зацверджаных навучальных планаў. Гэтыя навучальныя планы ляжаць у палках Наркамзема, чакаюць зацвярджэння.

Толькі 25 кастрычніка г. г. вынесена пастанова калегіі аб профілях спецыялістаў, а да гэтага часу большасць тэхнікумаў рыхтавала спецыялістаў наогул.

Кваліфікацыя спецыялістаў у значнай ступені залежыць ад пастаянай сувязі тэорыі з практыкай, агрэсіі кажучы, ад арганізацыі працэсаў прахаджэння студэнтамі вытворчай практыкі. Між тым з 17 тэхнікумаў толькі 14 маюць сваю ўласную вытворчую базу. Студэнтаў гідратэхнікума пасылаюць на практыку па будаўніцтву гідраэлектрастанцый без прахаджэння тэарэтычнага курса гэтага прадмета. Студэнтаў брагінскага тэхнікума буйной рагатай жывёлы пасылаюць на практыку і перад ад'ездам загалчык навучальнай часткі іх інструктаваў: «Купіце кніжачку аб кармленні жывёлы і па дарозе прачытайце яе». Студэнтаў пасылаюць на практыку ў якасці зоатэхнікаў, а аб гэтым прадмеце яны яшчэ ніякага ўяўлення не маюць. Студэнтаў - агароніжаў курасоўскага тэхнікума пасылалі на практыку па жывёлагадоўлі. Такіх фактаў з вытворчай практыкі можна было-б прывесці шмат. З 25-ці спраўдзілі студэнтаў-практыкантаў смілавіцкага тэхнікума аб іх практыцы, толькі 6 прынялі здавальняючымі, а астатнія 19 студэнтаў ніякай практыкі па іх спецыяльнасці не набылі.

Вытворчай практыкай студэнтаў ні тэхнікумы, ні сектар кадраў Наркамзема па-сапраўднаму не займаліся і як належыць не арганізавалі. Нязнаннямі падбора кадраў спецыялістаў-педагогаў для тэхнікумаў, іх ідэйнай вытрымаласці, марксіцка-ленінскай метадалогіі ў Наркамземе не займаюцца. У тэхнікумах сістэмы Наркамзема можна знайсці выкладчыкаў, якія выдуць ад 16 да 10 дысцыплін: гісторыю класавай барацьбы, зоатэрэнарыю, глебазнаўства і г. д.

Выкладчыцкі склад асобна спецыяльных дысцыплін тэхнікумаў засмечан кулацка-нацдэмаўскімі элементамі. Выкладчык чачарскага тэхнікума Сяргейчык, адкрыта даказваў студэнтам аб немагчымасці скарыстання камбайнаў у БССР. Чыстка партыйных ячэек вырыла цэлы рад кулакоў, нацдэмаў на пасадах дырэктароў, загалчыкаў навучальных частак, выкладчыкаў с.-г. тэхнікумаў (Марыіна-Горкі, Коханава).

Матэрыяльна-бытавыя ўмовы студэнтаў некаторых тэхнікумаў выхаваўчыя, культурна-масавая работа пастаўлены з рук вон дрэнна. У выніку, мы маем вялізарнейшы адсеў з гэтых тэхнікумаў, дасягаючы да 50 проц. набора. Так, у курасоўскім тэхнікуме з 113 студэнтаў адсеялася 40 чал., у брагінскім — 40, у смаляцінскім — 71.

Набор 1933-34 года ў большасці тэхнікумаў сарваны. Замест 1350 чал. набрана ўсяго 854. «Осоавиатрэтели» Наркамзема ўхітрыліся адным росчыркам ня з'ліквідаваць гэты прарыў і ў афіцыяльных справаздачах пішуць аб выкананні плана набора, і далі распаражэнне кожнаму тэхнікуму адкрыць падрыхтоўчыя курсы, з мэтай выканаць ня плана набора.

Пастановы ЦВК аб вышэйшай і сярэдняй школе, пастанова ЦК аб варонежскім с.-г. інстытуце не знайшлі калі жрэбна праламлення ў рабоце сектара кадраў Наркамзема.

Існуючае становішча падрыхтоўкі спецыялістаў для сельскай гаспадаркі патрабуе карэннай змены. Сектар кадраў Наркамзема павінен быць пашоўнен кваліфікаванымі інструктарамі-метадыстамі. Кожнаму тэхнікуму Наркамзема выслаць зацверджаныя праграмы і навучальныя планы, распрацаваныя для кожнага тэхнікума ў паасобку. Сектар кадраў павінен распрацаваць праграмы вытворчай практыкі студэнтаў, накладзіць інструктараў і праверку праходжэння яе студэнтамі. Забяспечыць тэхнікумы высока - кваліфікаванымі, ідэйна - вытрымаўымі спецыялістамі - педагогамі, палепшыць матэрыяльна-бытавыя ўмовы студэнта С.-г. установы павінны рыхтаваць спецыялістаў, якія сапраўды змогуць рушыць уперад развіццё сельскай гаспадаркі на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі.

ПАЛЯШЧУК.

ТАМ, ДЗЕ КІРУЮЦЬ ПЕРАРАДЖЭНЦЫ

Кадры спецыялістаў аграхімікаў, глебазнаўцаў сярэдняй кваліфікацыі для БССР рыхтуе кохалінскі тэхнікум аграхіміі і глебазнаўства, арганізаваны ў 1932 г. Падрыхтоўка спецыялістаў аграхімікаў патрабуе стварэння моцнай вытворчай базы, спецыяльна-абсталяваных лабараторый. Стан-жа працы ў тэхнікуме спачатку яго арганізацыі і да гэтага часу сведчыць аб тым, што тэхнікум са сваёй задачай падрыхтоўкі аграхімікаў, якія-б аўладалі марксіцка-ленінскай метадалогіяй, не спраўляецца. І вось па якіх прычынах.

Дырэктар тэхнікума Яршоў справай арганізацыі вучэбна-педагагічнага працэса, выхаваннем студэнтаў ні колі не займаўся. Уся работа пушчана на самацёк. Тэхнікум не мае свайго вытворчага плана. За ўвесь час існавання тэхнікума не праведзена ні адной вытворчай нарады выкладчыкаў, студэнтаў. Рамонт вучэбных памяшканняў, пабудова лазні, абсталяванне лабараторый з-за выключнай нядбайнасці Яршова знаходзяцца пад пагрозай зрыва.

У самы гарачы час, калі патрэбна было разгарнуць работу па падрыхтоўцы да навучальнага года, дырэктар заняўся неўгрунтаванымі разважаннямі аб пераводзе тэхнікума ў Горкі і фактычна праваліў камплектаванне тэхнікума студэнтамі, сарваў закладку вопытных участкаў па хімізацыі. Заработная плата выкладчыкам па 2 - 3 месяцы не выплачваецца, што выклікае зусім правільнае незадавальненне выкладчыкаў. Замест таго, каб прыняць захады да ліквідацыі гэтых ненармальнасцяй, дырэктар бюракратычна адказвае: «Настаўнікаў зараз колькі хочаш, не падабаецца вам, можаце пукаць сабе лепшае месца».

Не ўступае яму і яго намеснік — загалчык навучальнай часткі гав. Тарасевіч. З навучальнай справай у тэхнікуме поўны хаос. Праграмы не прапрацаваны і не даведзены да студэнцтва. Метадычная работа не арганізавана. Няма кантроля над работай выкладчыкаў. Культурна-масавая работа сярод студэнцтва не праводзіцца. І не дзіўна, калі ў такіх умовах сярод студэнтаў развіта п'янства і лаянка. Вытворчая дысцыпліна сярод студэнтаў зусім нізкая. Метады соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце тэхнікума не ўжываюцца. Матэрыяльна-бытавыя ўмовы студэнтаў кепскія. Стыдзіцца выдаецца ла кулацкаму прынцыпу—«усім пароўні». Загалчык гаспадаркі тэхнікума Ярэма — былы кулак—сістэматычна распраўвае хлеб са сталоўкі.

У выніку ўсяго гэтага з тэхнікума адсеялася 50 проц. студэнтаў. Партарганізацыяй выкрыт твар дырэктара Яршова, яго намесніка Тарасевіча. Яны абодва выключаны з партыі, як перараджэнцы, двурушнікі, якія замест работы займаліся самаснабжэннем у калгасах.

Ведаюць аб усім гэтым у Наркамземе, нават і інструктара свайго пры слалі для праверкі работы тэхнікума, які прасядзеў цэлы тыдзень у тэхнікуме і ніякай дапамогі яму не аказаў. Сектар кадраў Наркамзема яшчэ не можа знайсці замену для гэтых пазаменных «спецыялістаў», а кожны дзень іх прабывання ў тэхнікуме прыносіць вялікую шкоду ў яго рабоце.

Тэхнікум трэба неадкладна ачысціць ад апартуністаў, кулакоў і ўзмацніць кіруючымі кадрамі.

К-т.

„КРЕСТЬЯНСКОЙ ГАЗЕТЕ“ Ў ДЗЕНЬ ЯЕ ДЗЕСЯЦІГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ!

ЛЕПШАМУ ЗМАГАРУ ЗА ПРАЎДУ ЛЕНІНА СТАЛІНА

ВЕЛІКАМУ КАЛЕКТЫЎНАМУ АРГАНІЗАТАРУ МІЛЬЁННЫХ МАС ВЕСТКІ НА БАРАЦЬБУ ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАРОБКУ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКІ, НЯСТОМНАМУ ЗМАГАРУ ЗА НЕПАРУШНАСЦЬ САЮЗА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН — «КРЕСТЬЯНСКОЙ ГАЗЕТЕ» Ў ДЗЕНЬ ЯЕ ДЗЕСЯЦІГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ — ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ.

ПРАСЯКНУЎШЫ Ў САМУЮ ГУШЧУ СЯЛЯНСКІХ МАС, АБ'ЯДНАЎШЫ ВОКАЛ СЯБЕ ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ СЕЛЬКОРАЎ, «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» ВЫХАВАЛА З ІХ АКТЫЎНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ПАРТЫІ Ў СПРАВЕ БУДАЎНІЦТВА СОЦЫЯЛІЗМА, ЯКІЯ СВАІМ УЛАСНЫМ ПРЫКЛАДАМ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЎЗНІМАЛІ МІЛЬЁННЫЯ МАСЫ ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА НА БАРАЦЬБУ З КУЛАЦТВАМ, ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАЛГАСЫ, ЗА ЗАМОЖНАЕ КАЛГАСНАЕ ЖЫЦЦЁ.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО І НАДАЛЕЙ «КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА» БУДЗЕ НЕСЦІ Ў МАСЫ КАЛГАСНАГА СЯЛЯНСТВА ВЯЛІКУЮ ПРАЎДУ ЛЕНІНА—СТАЛІНА І АРГАНІЗОЎВАЦЬ ІХ НА ДАЛЕЙШУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ПАЛІТЫЧНАЕ І АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАННЕ КАЛГАСАЎ, ЗА ЎЗОРНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ДРУГОЙ ВЯСНЫ ІІ ПЯЦІГОДКІ, ЗА ЯШЧЭ БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК — КАЛЕКТЫЎНЫ АГІТАТАР, ПРАПАГАНДЫСТ І АРГАНІЗАТАР!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КІРАЎНІК І АРГАНІЗАТАР ПЕРАМОЖНАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА — УСеКП(б) НА ЧАЛЕ З ТАВ. СТАЛІНЫМІ

«ЗВЯЗДА».

Арганізатар мас калгаснага сялянства

Прывітанне ЦК комсамола „Крестьянской газете“

Баявому арганізатару мас калгаснага сялянства — «Крестьянской газете» — у дзень яе 10-гадовага юбілея большэвіцкае прывітанне ад ленінскага комсамола.

10-гадовы шлях «Крестьянской газеты» — гэта шлях бесперапыннай барацьбы за ўмацаванне саюза рабочага класа і сялянства, за перамогу генеральнай лініі нашай партыі, за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, супроць кулацтва і яго агентаў.

Толькі наша большэвіцкая партыя, мірумая ленінскім ЦК УсеКП(б) і любімым праводыром тав. Сталіным, магла отварыць друк, які так моцна, непарыўна звязан з найшырэйшымі пластамі працоўных, як «Крестьянская газета».

У яшчэ большым умацаванні гэтых сувязей з масамі, у павышэнні сваёй арганізуючай ролі ў справе выканання задач партыі — зарука далейшых поспехаў газеты.

Жадаю газеце далейшага працвітання, жадаю новых поспехаў у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за пераўтварэнне ўсіх калгаснікаў у заможных.

Сакратар ЦК УсеЛКСМ
А. КОСАРАЎ.

10 ГОД БОЛЬШЭВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ

23 лістапада 1933 года ў выкананне пастановы XII з'езда партыі пад лозунгам: **«Няхай жыве саюз рабочых і сялян»** выйшаў першы нумар **«КРЕСТЬЯНСКОЙ ГАЗЕТЫ»**.

На працягу 10 год свайго існавання газета з большэвіцкай паслядоўнасцю мацавала готы брацкі саюз, праводзячы пастановы партыі, выхоўваючы вясковых партыйцаў і беспартыйных актыў у духу непрымірымай барацьбы з усякімі ўхілам ад генеральнай лініі партыі, перавыхоўваючы ўчарашніх любных гаспадароў у свядомых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства.

«Крестьянская газета» пачала выходзіць усяго толькі 60-тысячным тыражом. Але потым з года ў год, усё шырэй і шырэй разгортваючы ў вёсцы палітычную масава-выхаваўчую работу, газета давяла свой тыраж больш чым да 3.200 тыс. экземпляраў.

У першую гадавіну «Крестьянской газеты» тав. Сталін напісаў:

«Крестьянская газета», беражы сваіх селькораў як сваё вока. Гэта — твая армія. Звяжыся як наймацней з прасцейшымі і свядомейшымі з сялян, асабліва з былымі чырвонаармейцамі. Гэта — твая апора. Насаджай праўду ў вёсцы і трубі, што вызваленне сялян немыслімо без брацкага саюза з рабочымі, што перамога працы над капіталам немагчыма без кіраўніцтва сялянамі з боку рабочых».

Выконваючы лозунг тав. Сталіна, «Крестьянская газета» арганізуе, вылучае і выхоўвае дзесяткі тысяч селькораў як палітычных байцоў, як памочнікаў партыі, як будаўнікоў соцыялістычнай вёскі, як будучых журналістаў або вясковых грамадскіх работнікаў.

Звыш мільёна лістоў атрымлівае «Крестьянская газета» з вёскі, сотні тысяч лістоў пасылае яна туды. Ці-ж гэта не паказальнік найглыбейшага пранікнення газеты ў самую гушчу сялянскіх мас.

«Крестьянская газета» прайшла слаўны шлях барацьбы за генеральную лінію партыі.

Пад кіраўніцтвам ЦК партыі, усё шырэй і шырэй разгортваючы работу, усё глыбей і глыбей пранікаючы ў свядомасць мільённых мас сялянства, яна настойліва, упарта, паслядоўна змагаецца за большэвіцкія калгасы і заможных калгаснікаў.

„КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА“ ВУЧЫЦЬ ЯК ЗМАГАЦЦА ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАЛГАСЫ І ЗАМОЖНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПОЛАЦАК, 20. (Па тэлефону).

Селькоры Ветрынскай МТС сустракаюць юбілей «Крестьянской газеты» шасцюховым завяршэннем сельска-гас падарчага года ў калгасах.

Гэтымі днямі па ініцыятыве калгаздзела і палітаддзелаўскай газеты Ветрынскай МТС—«За большэвіцкія калгасы» быў склікан другі селькораўскі злёт, прысвечаны скончанню гаспадарчага года і юбілею «Крестьянской газеты».

Селькоры ў сваіх выступленнях дзя ліліся вопытам работы, расказвалі, як яны на справе змагаліся за рэалізацыю лозунга правадыра партыі тав. **СТАЛІНА**—зрабіць калгасы большэвіцкімі і калгаснікаў заможнымі. 80 проц. калгасаў прышлі да злёта з поўным выкананнем абавязацельстваў перад дзяржавай па ільну, збожжу і натуральнае. Усе калгасы Ветрынскага сельсовета скончылі зяблева.

Калгасам шмат дапамог ізавы друк і асабліва **«Крестьянская газета»**, якая сістэматычна вучыць калгаснікаў як лепш паставіць гаспадарку, як змагацца за заможнае і культурнае жыццё.

Калгас **«Кастрычнік»**, Гомельскага сельсовета, некаторы час лічыўся адсталым у зоне МТС. Калгаснікі пачалі выпісваць газету, арганізавалі калгасныя чыткі ў брыгадах у часе адпачынку, выразкі асобных артыкулаў газеты вывешваліся на відным месцы. Пры дапамозе насценгазеты выгналі з калгаса кулакоў і дэзэртыраў. У результаце калгас «Кастрычнік» атрымаў першы квіток у раёне па здачы збожжа, першым прыступіў да ўдзьма зяблева і зараз лічыцца адным з лепшых. Старшыня калгаса быў дэлегатам на другім усебеларускім з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў. Зараз у калгасе разгарнулася вялікая работа ка сустрэчы юбілея «Крестьянской газеты» размеркаваннем ураджаю і лепшай падрыхтоўкай да зімы.

Калгас «Іскра», таго-ж сельсовета, таксама стаў перадавым, дзякуючы разгортванню соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, арганізацыі калектыўнай чыткі «Крестьянской газеты», умацаванню працоўнай дысцыпліны.

Селькоры заявілі, што «мы проста без газеты зараз жыць не можам». Вопыт работы «Крестьянской газеты» ў разве калгасаў перанеслі ў брыгады і ўмацавалі ізавы друк. Асаблівай увагі заслугоўвае вопыт работы насценгазеты калгаса «Чырвоны араты», Астроўскага сельсовета (рэдактар насценгазеты комсамолец **Рашыцкі**). На старонках насценгазеты праводзіцца пераклічка лепшых брыгад, падбіваюцца адстаючыя.

У азнаменаванне юбілея ўдзельнікі злёта ўзялі на сябе цэлы рад канкрэтных самаабавязацельстваў, накіраваных на выкананне гаспадарчага года і падрыхтоўкі да сустрэчы зімы. Селькоры ўзялі пад свой нагляд работу мяльна-сушыльных пунктаў, аба вязаліся здаваць ільнавалакно дзяржаве не пазней 10-11 нумара і правялі масавую работу серод калгаснікаў і адпаасобнікаў аб здачы высокаякаснага ільнавалакна.

— Сэмыку насенных, страхавых і фуражных фондаў мы павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль — заявілі ўдзельнікі злёта.

Кожны селькор тут-жа на злёце абавязаўся, прыехаўшы ў свой калгас, арганізаваць праверачныя брыгады з лепшых калгаснікаў-ударнікаў для праверкі якасці насення і захавання яго.

Селькоры ўключыліся ў паход па вывучэнню апратэхнікі і абавязаліся на працягу самага кароткага часу вывучыць адну культуру.

Пры палітаддзеле створан спецыяльны штаб для праверкі выканання ўзятых на сябе абавязацельстваў.

Злёт паслаў па ўсесаюзны з'езд «Крестьянской газеты» лепшага калгасніка-ўдарніка, рэдактара насценгазеты «Чырвоны араты» комсамольца **Рашыцкага**, які з'яўляецца лепшым ударнікам (выпрацаваў 300 працадзён), паказаў масавую чытку «Крестьянской газеты» і масавую работу ў брыгадах, у результаце чаго калгас першым па зоне МТС разлічыўся з дзяржавай і прыступіў да размеркавання ўраджаю.

Фрыц.

Усесаюзная нарада селькораў

МАСКВА, 20.

У дзень святкавання 10-годдзя «Крестьянской газеты» 23 лістапада ў Калонным залі Дома саюзаў адкрываецца ўсесаюзная нарада селькораў. У рабоце нарады прымуць удзел дэлегаты абласнога, раённага і палітаддзельскага друку, палітаддзелаў МТС, рабкоры і дэлегаты заводаў трактарнага і сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва. У Доме саюзаў адкрываецца выстаўка, прысвечаная рабоце «Крестьянской газеты» за мінулыя дзесяць год.

Ініцыятыва селькора Астасеча

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу).

Па ініцыятыве селькора Астасёка калгас імя **Молатава**, Мадорскага сельсовета, адзначае юбілей «Крестьянской газеты» завяршэннем падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы.

Да дня юбілея ў калгасе арганізуецца чырвоны куток, пурток агратэхнікі, устанаўляецца радыё-прыёмнік.

Вярхоўскі.

НАДЗЯЛЕННЕ БЕСКАРОЎНЫХ КАЛГАСНІКАЎ ЦЁЛКАМІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕАДКЛАДНАЙ І ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ

„Сакратары райкомаў, старшыні РВК, начпалітаддзелаў МТС нясуць за гэта персанальную адказнасць“
(з пастановы ЦК КП(б)б)

За рэзалюцыямі справы не відаць

РАГАЧОЎ. (Ад наш. улясн. кар.). Як йдзе ў калгасах надзяленне бескароўных цёлкамі, загадчык Рагачоўскага райза тав. **Еўдачкоў** не ведае.

— Бачыце, калгасы даготуль яшчэ вестак не прадставілі, — вось стэрэатыпны адказ загадчыка райза

Між тым дапамога бескароўным калгаснікам у раёне не арганізавана. Больш таго, ніхто добра не ведае колькі ёсць бескароўных. Па вестках сельсоветаў як быццам у 471 гаспадарцы, а ў сапраўднасці значна менш. Возьмем хоць-бы **Дварэцкі** сельсовет, ён прыслаў весткі аб наяўнасці ў калгасах сельсовета 54-х бескароўных гаспадарак, а пры праверцы аказалася ўсяго толькі 33.

— Як-жа так атрымліваецца? — пытаем у загадчыка райза.

— Мабыць гэтыя гаспадаркі ўжо набылі кароў, — бессаромна адказвае ён.

Такога таксама невядома ў райза аб колькасці закупленых і закантрактаваных цёлак у калгаснікаў і ў адпаасобнікаў.

Не больш ведае і дырэктар Рагачоўскай МТС тав. **ДРАЧОЎ**, які заблытаўся паміж трыма соснамі і ніяк разабрацца не можа. Аб бескароўных калгасніках у раёне дзейнасці МТС у яго ёсць тры лічбы: 259, 196 і 172. Якой лічбе верыць — невядома. Бралі весткі са слоў, са столі.

— А колькі-ж бескароўных калгаснікаў атрымалі цёлак, — пытаем тав. Драчова.

— А хто-ж іх ведае, — адказвае той. — Хіба мы ўлічваем гэта.

У выніку такіх апартуністычных адносін да арганізацыі дапамогі бескароўным, мы маем у раёне вось якое становішча.

У калгасе **«Чырвоны партызан»** калгасніца **Новікава** вось ужо каторы час як хадайнічае аб водпуску ёй цёлкі. Але старшыня калгаса **Дзівачэнка** ніяк не можа сабрацца ёй нават адказаць.

У калгасе **«Чырвоныя баркі»** два **аднаасобнікі** закантрактавалі цёлак для бескароўных, але падпаўны пад кулацкую агітацыю, яны забралі цёлкі назад. Праўленне калгаса даготуль яшчэ не склапацілася давесці да ведама ўсіх калгаснікаў і аднаасобнікаў аб ільготах, якія даюцца ўрадам тым, хто кантрактуе цёлкі для бескароўных калгаснікаў.

У раёне не даецца адпора кулацкай агітацыі супроць дапамогі бескароўным.

Сакратар ячэйкі калгаса **«Чырвоная армія»** тав. **Лайко** на нарадзе старшынь калгасаў выступіла з агітацыяй супроць надзялення бескароўных цёлкамі, кажучы, што нікому гэта непатрэбна.

Такія кулацкія настроі ёсць у радзе другіх калгасаў («Ленінскае жыццё», «Чырвоныя баркі»).

Райком і РВК абмяжоўваюцца толькі вынясеннем бясконцых розалюцый па гэтаму пытанню, але канкрэтнай справы пакуль што не відаць.

Так далей цягнуцца не можа. Райком павінен безадкладна выканаць дырэктыву ЦК КП(б)Б аб арганізацыі да 25 лістапада куставых злётаў бескароўных калгаснікаў сумесна з калгаснікамі і аднаасобнікамі, маючымі цёлак. Трэба ў раёне вылучыць атказных упаўнаважаных райкома па раённых сельсоветах з тым, каб дабіцца безадкладнага выканання пастановы ЦК аб дапамозе бескароўным калгаснікам у набыцці цёлак.

ВЯРХОЎСКІ.

Закантрактавалі... адну цёлку

БЕШАНКОВІЧЫ. Два тыдні пасля пастановы партыі і ўрада аб арганізацыі дапамогі бескароўным у Бешанковіцкім раёне на гэту тэму гаварылі. Гаварылі, абмяркоўвалі, намечалі планы. Пасля і гаварыць кінулі. Намечаныя праекты на сёнешні дзень ляжаць у шафах райза. Тут лічаць, што ўся справа ўжо зроблена.

Аграном райза **Жылінскі**, складаўшы гэты план, проста і заяўляў: «патрэбен план — я склаў яго, а далей шукай самі робяць». Праўда, 12 кастрычніка ён тэлеграфна паведаміў Наркамзему аб тым, што ў раёне разгорнута масавая работа па закупцы цёлак. Жылінскі ведаў тады, што гэта хлусня, што нічога падобнага ў раёне няма. — Але... патрабуюць—паслаў,—кажа ён.

Вось з такім апушчэннем у Бешанковіцкім раёне праходзіць уся работа да арганізацыі дапамогі бескароўным. У раёне 454 бескароўных калгасных гаспадаркі. Меркавалася ўзяць 150 цёлак на калгасных фермах і 304 закантрактаваць або закупіць. Даготуль закантрактавана з усяго плана толькі адна цёлка.

Між тым у раёне ёсць усе магчымасці поўнасцю выканаць і перавыканаць гэты план. На дакладных вестках у рабоце ўсяго 1780 дёлак, з іх на калгасных фермах 936, у калгасах, без таварных ферм,—477, у аднаасобных карыстанні калгаснікаў—54 і ў аднаасобнікаў—313.

Гэта значыць, што ёсць дзе закупляць, ёсць дзе кантрактаваць. Але з ад пушчаных дзяржавай 13.376 руб. кредыта такіх пакуль што не скарыстана ні адна капейка. А попыт на цёлкі ёсць і з **Сакораўскага** сельсовета, дзе 86 бескароўных калгаснікаў, **Бечойкаўскага**—67 бескароўных, **Свечынскага**—64, **Стрыліпічанскага** — 25.

Ні райса, ні райвыканкам'ы, ні райзямаддзела, ні райсельгаспбанка, ні райвыканкам'ы, ні райсельгаспбанка

У ЛЁЗНЕ НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ РАШЭННЯЎ ПАРТЫІ

У сваёй апошняй пастанове аб становішчы парткіраўніцтва і дапамогі ў рабоце комсамола ЦК КП(б)Б адзначаў слабую дапамогу комсамольскім арганізацыям з боку райкомаў партыі і катэгарычна патрадзіў, «што ўсякая недаацэнка значэння комсамола ва ўсёй рабоце ў горадзе і на вёсцы, спробы недапушчальных адносін з боку асобных партарганізацый да комсамола пацягнуць за сабой найстражэйшую адказнасць гэтых арганізацый.

Гэта пастанова сведчыць аб той вэр'ёзнай увазе, якую надае цэнтральны камітэт партыі рабоце комсамола. Аднак, у большасці раёнаў гэта важнейшая дырэктыва партыі не знайшла яшчэ практычнага праламлення. Комсамол па-ранейшаму застаецца па-за ўвагай партыйных арганізацый. У **ЛЁЗНЕ**, напрыклад, работа комсамола не толькі не ажывілася, але за апошні час значна аслабла. Райком КП(б)Б безадказна адносіцца да работы комсамола. Да гэтага часу не аказана практычная дапамога ў паладжанні ўлікі, праверкі становішча на месцах і перабудовы работы па вытворчаму прынцыпу. Па большасці комсамольскіх ячэек яшчэ не вызначаны партарганізацыі. Рад парт'ячэек і парторгаў палітычна недаацэньваюць значэнне комсамола. Сакратар **кальшанскай** парт'ячэйкі т. **Сокалаў** замест дапамогі ў перабудове комсамольскай работы, катэгарычна настойвае на зліцці ўсіх комсамольцаў у адну сельскую тэрытарыяльную ячэйку. Тав. **Шылаў**—сакратар парткалектыва фабрыкі імя **Карла Маркса** таксама ўпарта супраціўляецца перабудове комсамольскай арганізацыі па вытворчаму прынцыпу. Шылаў «даказваў», што перажіжка комсамольцаў-слухачоў у цэх, брыгаду нічога рацыянальнага не дасць. Партрымацаваны да комсамольскай ячэйкі калгаса **«Чырвоны араты»** т. **Лужнецкі М.** сваёй бяздзейнасцю давёў работу ячэйкі да развала. Комсамольцы не прымаюць удзела ў сельгаспрацах, і зараз калгас знаходзіцца ў глыбокім прарыве. Старшыня **Старабабыльскага** сельсавета т. **Абрыцкі** (комуніст) упарта пярэчыць супроць перакідкі комсамолкі **Ганчаравай** з каапэрацыі ў калгас, дзе яна лічыцца членам.

З прычыны страты класавага чуцця і раволюцыйнай пільнасці з боку асобных партыйных і комсамольскіх ячэек, комсамольская арганізацыя раёна значна засмечана класава-варожымі элементамі. У часе праверкі склада **унаўскай** ячэйкі выяўлена дачка буйнога арандатара **Аболіна**. Між тым сакратар парт'ячэйкі т. **Вевер** настойвала перад РК ЛКСМ аб астаўленні Аболінай у комсамоле, як «актывісткі».

Рашэнне райкома партыі аб перабудове комсамольскай работы да гэтага часу не рэалізавана. Выпіскі правядзення адзінага парткома аб комсамоле (15 кастрычніка) яшчэ не пацвердзены. Асобныя работнікі райкома партыі, як загадчык арганадзела т. **Кароткі** яўна недаацэньваюць работу комсамола. Кароткі зусім не клапоціцца аб умацаванні комсамольскіх ячэек добрымі віраўнікамі.

Брытыка і самакрытыка комсамольцамі слабога парткіраўніцтва і дапамогі комсамолу сустракаюць з боку сакратара РК КП(б)Б т. **Міцькова** і заг. арганадзела тав. **Кароткага** зняважу. На крытычнае выступленне пам. нач. політадзела МТС т. **Галле** на пленуме РК партыі тав. Міцькоў і Кароткі грэнічна заявілі—**«не трэба гарачыцца, за вас мы працаваць не будзем».**

Не гледзячы на вялікі нацыянальны перанлёт у комсамольскай арганізацыі, «ярод комсамольцаў не праводзіцца інтэрнацыянальная работы. У выніку мелі месца вылазкі шавіністычнага характэра з боку комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў **унаўскай** латышскай школе.

У раёне зусім не разгорнута комсамольская вучоба. У большасці ячэек не арганізаваны політшколы. Прапагандысты для зімовай вучобы не вызначаны.

Раённая газета **«Ленінскі сцяг»** таксама недаацэньвае работы комсамола. Указанні РК аб выпуску комсамольскай старонкі не рэалізуюцца. Нават да юбілея 15-годдзя комсамола газета не змясціла ніводнага радка аб рабоце раённай комсамольскай арганізацыі.

Такое становішча комсамола **Лёзненшчыны** і парткіраўніцтва ім патрэбуе неадкладных рашучых мер.

С. Грышчанка.

„Мэблябаязнь" і яе мікробы

Летам гэтага года, у сувязі з тым, што гандлюючыя арганізацыі не вялі барацьбы за якасць прадукцыі, не змаглася супроць прымусовага асартымента, у крамах і на складах стварыліся залежы нядобраякаснай мэблі. Партыя і ўрад прынялі рад мер, каб ліквідаваць затаварванне, зменшыць гандлёвыя націнкі, вызначылі цвёрдыя цэны на мэблю, перагледзелі асартымент. Гэта значна палепшыла становішча.

Аднак, у апошні час мы назіраем зусім іншы малюнак. Мэбля стала дэфіцытным таварам. У крамах цяжка знайсці такія прадметы, як шафы, кухонныя шафчыкі, добраякасныя матрацы і г. д.

Чым тлумачыцца гэта? Галоўная прычына ў тым, што большая частка заводаў і арцеляй, выпрацоўваючых мэблю, пасля таго як былі зацверджаны новыя цэны, а гандлюючыя арганізацыі выступілі супроць дрэннай якасці прадукцыі, згарнулі ўзагую работу.

Магілёўская арцель «Чырвоны мэбельшчык», гомельская арцель «Прагрэс», бабруйская «Чырвоны мэбельшчык» спынілі выраб прадметаў шырокага спажывання, пачалі практыкаваць прымусовы асартымент.

Спынёўшы выраб прадметаў шырокага спажывання, многія прамысловыя арцелі заняліся выключна выпрацоўкай мэблі для ўстаноў. Яны такім чынам груба парушылі дырэктывы партыі і сталі на шлях адкрытага сабатажа барацьбы за выраб тавараў шырокага спажывання.

Карэнні гэтага сабатажа ў тым, што прамысловыя арцелі **нічога не зрабілі, каб знізіць сабекошт прадукцыі**, каб рацыяналізаваць вытворчасць, каб палепшыць асартымент тавараў.

Беллеспрамсаюз натурае злачынная практыцы арцеляй. Старшыня Беллеспрамсаюза тав. **Ізраеліт** выступіў на нарадзе старшынь арцеляй з прамовай, у якой абараняў спарачэнне вытворчай праграмы. Яго выступленне яшчэ больш дэмабілізавала работнікаў прамысловай каапэрацыі, яно падтрымлівала сабатажнікаў. «Цэны на мэблю ў БССР,—заявіў Ізраеліт—ніжэй, чым у іншых рэспубліках, арцелі згарнулі работу таму, што гандлюючыя арганізацыі хочуць кажыць сабе палітычны капітал на барацьбе за якасць прадукцыі».

Так кіраўнік прамысловай каапэрацыі арыентуе работнікаў сістэмы, так імкнецца ён за рыкаванне дырэктыў партыі. Больш яркага правааапартуністычнага выступлення быць ня можа. Між іншым на гэта ніхто не рэагаваў.

Некаторыя арцелі ўступілі на шлях простага ашукаўніцтва,—яны паказваюць у зводках, што вытворчая праграма па шырспажыву выканана поўнасцю, між тым пад відам шырспажыву яны выпрацоўваюць рэдаметственную мэблю. Менская арцель «Драўпрацоўчык» выпусціла шмат так званых «пярэчнак», але іх у крамах няма. Яны заказаны інтэрнатамі, установамі. У той-жа час арцель дае весткі што праграма вырабу прадметаў шырспажыву выканана поўнасцю.

Не толькі арцелі, але і дзяржаўныя прадпрыемствы замест таго, каб знізіць сабекошт прадукцыі, каб палепшыць асартымент, скарацілі праграму, згарнулі работу (барысаўская фабрыка імя Халтурына, магілёўская мэблевая фабрыка).

Мала што зробіла, каб палепшыць якасць мэблі. Менская арцель «Драўпрацоўчык», не гледзячы на скаргі спажыўцоў і сігналы друку, лакіруе крэслы замест паліроўкі, кладзе пры лішае да сядзення. Крэслы робяцца з некалькіх парод дрэва. Можна ўявіць сабе, які выгляд мае такая прадукцыя. Вабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат паслаў у Менск два вагоны кухонных шафкаў дрэннай якасці пану якіх прышлося знізіць на 20 проц.

Яшчэ адзін характэрны факт. Менскі індустрыяльны тэхнікум дотэ час выпрацоўваў шафы і буфеты. Як толькі былі зацверджаны ніжэйшыя цэны, ён спыніў выпрацоўку мэблі і пакуль не пакінуў перацыніць тую мэблю, якая ўжо выпушчана. У выніку партыя шафаў стаіць нерэалізаванай да сённяшняга дня.

Кіруючыя арганізацыі ў сваіх пастановах падкрэслілі неабходнасць **максімальнага прасоўвання мэблі на вёску**. Аднак, на месцах гэтыя дырэктывы ігнаруюцца. Мы назіраем яўны кансерватызм, нежаданне гандляваць мэблі. Тут праяўляецца сабатаж гандля дастатковымі таварамі — каапэрацыйныя работнікі лічаць, што гэта—«грамоздкая, клапатлівая» справа, яны аддаюць перавагу гандлю дэфіцытнымі таварамі.

Да апошняга часу большасць міжраённых баз зусім не прадавалі мэблі, а тыя, якія рабілі што небудзь, працавалі вельмі дрэнна, заносілі вялікую колькасць мэблі аднаго асартымента, нізкай якасці і па дарагой цане. У выніку яны затаварыліся і пасля гэтага зусім спынілі гандаль мэблі.

Ва многіх спажывецкіх таварыствах можна пачуць гуткі, што «вёсцы мэбля непатрэбна», што калгаснік яе не купіць; тут яскрава праяўляецца вобчае наведванне новых умоў гандля, нежаданне вызучаць і арганізоўваць попыт спажыўца.

Нядаўна гандлёвае кіраўніцтва БКС разаслала міжраёбазам запытанне, якая мэбля ім патрэбна. Аказалася, што большасць баз інтэрнуюць гэтую справу. Клімавіцкая база дала заяўку на чацверты квартал на тры шафы і тры сталы, між тым яна аб'ядноўвае 54 сельспажыўтаварыствы. У раённых крамах мэблі няма і калгаснікі вымушаны ехаць у горад, каб купіць патрэбныя рэчы. Магілёўская база дала заяўку толькі на крэслы. Іншая мэбля ёй непатрэбна. Не жадаюць гандляваць мэбляю менская і аршанская міжраённыя базы.

Такія адносіны да гандля дастатковымі таварамі трэба прызнаць злачынным ігнараваннем дырэктыў аб разгортванні культурнага совецкага гандля.

ЦКК і прэзідыум Белкаапсаюза нядаўна пастанавілі **адкрыць у кожным раёне спэцыяльную краму для продажа мэблі.** Міжраённыя базы павінны арганізаваць спецыяльныя мэблевыя склады, у якіх сельспажыўтаварыствы і райсаюзы магі-б атрымаць тавар патрэбнага асартымента. Базы ўпарта не выконваюць гэтай пастановы, апраўдваючыся адсутнасцю памяшканняў. На справе-ж гэта тлумачыцца вылучна нежаданнем гандляваць недэфіцытнымі таварамі. Райсаюзы-ж (заслаўскі, смалявіцкі, прапойскі), не знаходзячы мэблі на базах, прымушаны зварачацца ў гандлёвае кіраўніцтва, сампрамабіліраванае або непасрэдна на прадпрыемствы.

Некалькі слоў аб кіраўніцтве гандлем мэблі. Дагэтуль існуюць дзве арганізацыі, якія займаюцца гэтым—гандлёвае кіраўніцтва БКС і сампасаб'яднанне. Недапушчальна, каб адным і тым-жа займаліся дзве арганізацыі.

Пытанні гандля мэбляй заслугоўваюць вялікай увагі, іх трэба паставіць у парадак дня.

ХІНІЧ.

Вытруціць „нэпманскі дух"

Віцебск — адзін з буйнейшых пролетарскіх цэнтраў Совецкай Беларусі. ЗРК Віцебска закліканы абслужыць дзесяткі тысяч рабочых.

Як працуе Віцебская рабочая каапэрацыя? Як змагаецца яна за выкананне прамфінплана? Як задавальняе яна ўзрослыя матэрыяльна-бытавыя патрабаванні рабочых мас? Па гэтых пытаннях брыгадай ЦБК, «Звязды» і Белкаапсаюза было праведзена абследаванне. Абследаванне паказала, што многія ЗРК не перабудавалі сваёй работы, працуюць старымі метадамі, жывуць учарашнім днём.

Возьмем ЗРК абутковай фабрыкі імя Лекерта, які абслугоўвае 960 рабочых. Каапэратыў забяспечан сродкамі для разгортвання тавараразвароту і самазагатовак. Ён мае сваю прыгарадную гаспадарку, рад крам, сталоўку. База для дзейнасці вельмі шырокая. Тым не менш ЗРК зусім не спраўляецца са сваімі абавязкамі. Запытайцеся ў праўлення ЗРК (старшыня тав. **УГОРЫЦ**), як выканан план тавараразвароту, яно вам адкажа: «Працуем добра, план 3-га квартала перавыкананы на 5 проц.» Супроць гэтай лічбы недыя пярэчыць. Але аналіз гандлёвай работы ЗРК гаворыць аб зусім іншым: аб поўным ігнараванні запатрабаванняў рабочых, аб захаленні спекуляцыйнымі элементамі.

Снабжэнне рабочых фабрыкі імя Лекерта далёка нездавальняючае, у той-жа час ЗРК, закупіўшы вагон селядцоў, прадае іх па 10 тыс. рубл. іншым арганізацыям.

Каапэратыў праваліў самазагатоўкі. За тры месяцы загатоўлена толькі 6 тон тварагу (па нарадах). 420 кгр. мяса, 400 кгр. маслёнкі. Вось і ўсё. Між тым ЗРК прымацаваны да 5-ці сельсоветаў Віцебскага раёна. Ёсць вялікае поле для разгортвання самазагатовак. Трэба было заключыць дагавары з калгасамі, праявіць настойлівасць і ініцыятыву. ЗРК гэтага зрэбіць не здолеў, ён не прычыніў пітых мер, каб палепшыць рабочае снабжэнне.

Папікаўцеся, адкуль атрымлівае прадукты сталоўка фабрыкі. Прадукцыя паступае з двух крыніц — з цэнтралізаваных фондаў і ад рынка. Замест арганізацыі самазагатовак у калгасах, ЗРК уступіў на шлях найменшага супраціўлення — ён закупаў прадукты на рынку і плаціў за іх па спекуляцыйных цэнах. Ён сваімі «загатоўкамі» ўзбуйніваў цэны на рынку.

Гэта прывяло да падарожання абедаў, ды нізкай якасці іх. Так ажыццяўляе ЗРК фабрыкі імя Лекерта дырэктыву партыі аб палепшэнні грамадзкага харчавання.

Якасць абедаў у сталоўцы незадавальняючая. Часта на абед падаюцца зусім астыўшыя стравы. Калі рабочы спозніцца на некалькі мінут, ён прымушан есці халодны абед. Адсюль пастаянае змяншэнне колькасці наведвальнікаў.

Аб якасці кіраўніцтва прыгарадняй гаспадаркай можна судзіць па таму, што нормы выхада прадукцыі не выкананы: з 36 га замест 400 тон бульбы знята 200.

Не лепш становішча і на ЗРК шчотачнага камбіната, які абслугоўвае 1.600 рабочых. ЗРК пераведзен на новыя формы продажтавання, забяспечан сродкамі. Ён мае ўсе магчымасці правядзіць вялікую работу, але праўленне ЗРК (тав. **Ерошкін**) мала турбуецца аб палепшэнні рабочага снабжэння. Выдаткі зварота перавышаюць ліміты; у першым квартале яны складалі 16,3 проц., замест 9,5, а ў другім квартале яны перавысілі ліміт амаль у два разы. Той-жа малюнак і ў трэцім квартале. У выніку перавыдаткавана за адно толькі паўгоддзе каля 20 тыс. руб.

Для характарыстыкі работы ЗРК да волі сказаць, што ён зусім не закупае прадукцыі па канвенцыйных цэнах. Самазагатоўкі «выпалі» з планаў работы ЗРК. Затое ён не забывае наведваць прыватны рынак. Там закупаюцца прадукты, патрэбныя для сталоўкі, у сувязі з чым пераплачваюцца дзесяткі тысяч рублёў, якія трапяць у кішэні рынкавых спекулянтаў. Якасць абедаў вельмі нізкая. Калярыйнасць харчоў да апошняга часу не перавышала 250. Ці патрэбны камментарыі, каб даказаць агідную работу сталоўкі і праўлення ЗРК!

Работнікі праўлення спадзяюцца, што дзяржава дапаможа, што цэнтралізаваныя фонды вывязуць, прыкрыюць хібы ў рабоце. Упрыманчыя настроі адчуваюцца на кожным кроку.

Нядаўна на фракцыі заўкома дырэктар тав. **МАЦКІН** выступіў з антыпартыйнай, яўна апартуністычнай прамовай: «Мы даем дзяржаве прадукцыю па мільёны, а на нас не звяртаюць увагі, не пераводзяць на лепшае снабжэнне. Мы не маем магчымасці займацца самазагатоўкамі працуктаў таму, што ў нас няма тавараў для стымулявання» (чытай — тавараабмена).

Гэта антыпартыйнае выступленне не сустрэла адпора на фракцыі. Замест таго каб арганізаваць самазагатоўкі ў прымацаваных сельсоветах, людзі жывуць надзеямі на цэнтралізаванае снабжэнне, на чысоці дапамогу. Апартуністычная размагнічанасць, нежаданне і нядольнасць палепшыць работу — толькі так можна характарызаваць кіраўніцтва рабочым забеспячэннем на шчотачным камбінаце.

Брыгада абследавала таксама ЗРК керамікаў, які снабжае ад 1.200 да 2.000 рабочых. Праўленне ЗРК на чале са старшынёй **СІГЕРАМ** замест канцэнтрацыі ўсёй увагі на палепшанні рабочага снабжэння, занялося спекуляцыйным ганцлем. Яно выконвае план тавараразвароту за кошт гуртавога ганцля. Праўленне прадало орсу касцюковіцкага лесапрамгаса капусці, штаны, панчохі. Шклоўскаму гарспажыўтаварыству праданы гарнітуры, мануфактура. ЗРК завязаў нават сувязь з Заходняй вобласцю і туды перапрадаў мануфактуру, нітки, абутак, валёнкі.

Атрыманыя грошы ўключаны ў зводку выканання плана тавараразвароту. Хіба гэта не яўнае ашукаўства? Хіба гэта не самае злачыннае ігнараванне дырэктыў партыі і ўрада! Трэба дадаць, што ЗРК парушыў цэны, устаноўленыя дзяржавай на тавары, вызначаныя для вёскі.

Усе гэтыя даныя сведчаць аб неабходнасці неадкладнага аздараўлення работы ЗРК. Трэба прыняць самыя рашучыя меры да апартуністаў — зрыўшчыкаў рабочага снабжэння.

Брыгада ЦКК, «Звязды» і БКС — КАГАН, СВЕРДЛОЎ.

ЗА МЯЖОЙ

ВЫСТУПЛЕННІ СУПРОЦЬ ЯПОНСКАГА ІМПЕРЫЯЛІЗМА Ў АКУПАВАНАЙ МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Амерыканскі журнал «Чайна ўіклі рэв'ю» паведамляе, што Японія да гэтага часу не дабілася «ўціхамірання Манчжурыі». Адсутнасць падтрымання з боку насельніцтва прыводзіла да крытычнага палітычнага становішча ў Манчжурыі.

— Рад апошніх падзей у Манчжурыі, — піша журнал, — прымушаюць японскія ваенныя ўлады ўстанавіць самую суровую цэнзуру інфармацыі адносна Манчжурыі. Аднак, факты ўсё-ж становяцца вядомымі.

— Расходы на падтрыманне «міра і парадка» ў Манчжурыі, — піша далей журнал, — складаюць самы буйны артыкул у манчжурскім бюджэце. Паводле нядаўніх паведамленняў, асігнаванні на «абарончыя мэты» дасягаюць 50 млн. кітайскіх даляраў, пры чым гэта сума з'яўляецца далёкаю да расходаў японскай арміі ў Манчжурыі.

«Але нават гэтыя расходы, — піша журнал, — недастатковы для захавання лаяльнасці так званай манчжурскай арміі. Пастаянныя паведамленні газэт аб паўстаннях у манчжурскіх войсках, якая часта суправаджаюцца забойствам японскіх афіцэраў кітайскімі салдатамі».

Паводле слоў журнала, генерал Хаторы — камандуючы 7-й японскай брыгадай, які нядаўна вярнуўся з Японіі ў Манчжурыю, заявіў, што брыгада спрацыла 520 афіцэраў і салдат у часе сутычак з «бандытамі».

АВАРЫЯ САМАЛЁТА „К-7"

ХАРКАЎ, 22. (БЕЛТА).

21-га лістапада каля 3-х гадзін дня з прычыны катастрофы самалёта «К-7» загінулі: пэф - пілот тав. **СНІГІРОЎ**, начальнік мантажнага цэха авіязавода інжынер **ЖЭРОНКІН**, прадстаўнік галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флота **ЛІППА**, галоўны механік **ВЛАСАЎ**, борт-механік **БАРЫШНІКАЎ**, борт-механік **КАНАПЕНКА**, інжынер-канструктар **ШКЛОЎСКІ**, інжынер - канструктар **ЗАРЭЦКІ**, начальнік аддзела тэхнічнага кантроля **ПАПЧЫНСКІ**, сакратар комсамольскай ячэйкі авіязавода **ЛІМАНСКІ**, рабочы па прыладах **ЗАЙЦАЎ**, рабочы па абшыўцы **ПЛЕЦІНСКІ**, наглядальнік **ПІЛАШ**, рабочы **САХНО**.

Для расследавання прычын катастрофы створана ўрадавая камісія ў складзе Сухамліна (нарком РСІ), Кацнельсона (начальнік абЛДПУ), Венедзіктава (прокурор вярхоўнага суда), Бохрунага і Пуркаяева.

ТЭЛЕГРАМА тав. УНШЛІХТА ХАРКАЎСКАМУ АВІЯЗАВОДУ

МАСКВА, 22. (БЕЛТА)

Начальнік галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флота тав. Уншліхт у сувязі з катастрофай з самалётам «К-7» адправіў у Харкаў пастаўную тэлеграму:

«Харкаў, авіязавод, трыкутнику завода.

Ад імя лётчыкаў, рабочых і інжынераў грамадзянскага паветранага флота выказваю глыбокі жаль па повазу цяжкай катастрофы, вырваўшай з радоў калектыва завода лепшых упарнікаў будаўніцтва паветранага флота. Упэўнен, што рабочы калектыў завода знойдзе сілы ў найкарацейшы тэрмін пакрыць цяжкую ўтрату новымі вытворчымі дасягненнямі.

Начальнік ГУПФ **УНШЛІХТ».**

НАХАБНАЯ ПРАВАКАЦЫЯ АРЫШТ 14 СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

ТОКІО, 19 лістапада. (БЕЛТА).

АГЕНЦТВА ДЭМПО ЦУСІН ПАВЕДАМЛЯЕ З ХАРБІНА, ШТО АХОВА КУЧ 17-га ЛІСТАПАДА АРЫШТАВАЛА 14 СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН. СУТНАСЦЬ «СПРАВЫ» І ПРЫЧЫНЫ АРЫШТА ТРЫМАЮЦЦА Ў САКРЭЦЕ.

ГЕРМАНА-ПОЛЬСКАЯ ЗГОДА ПА ПЫТАННЯХ ГАНДЛЯ

БЕРЛІН, 22 лістапада.

Згодна паведамлення Вольф, у Берліне парафіравана германа-польская згода аб гандлі жытам. Змест згоды яшчэ не апублікован.

САКРЭТНЫЯ ПЕРАГАВОРЫ ДОЛЬФУСА З АЎСТРЫЙСКІМІ НАЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТАМІ

ПАРЫЖ, 21 лістапада. (БЕЛТА).

«Журналь дэ дэба» паведамляе, што згодна вестак з пайнфармаваных крыніц аўстрыйскі прем'ер Дольфус пачаў сакрэтныя перагаворы з аўстрыйскімі нацыянал-соцыялістамі аб уключэнні іх у склад урада. Газета паведамляе, што нацыянал-соцыялістам будзе прапанаван у прыватнасці партфель міністра замежных спраў.

Побач з гэтым берлінскі карэспандэнт «Журналь дэ дэба» паведамляе, што ў гутарцы з польскім пасланнікам Ліпскім Гітлер выказаў нібыта пакаяданне, каб Польшча ў плане агульнай палітыкі згоды з Германіяй захавала пасўную пазіцыю, калі ў сілу непрадбачаных акалічнасцяй адбудзецца змена палітычнага рэжыма ў Аўстрыі. Газета выказвае вялікі непакой па поваду гэтых паведамленняў і патрабуе прыняцця энергічных папераджальных мер.

ЧАРГОВАЯ „НЕЗАЛЕЖНАЯ" ПРАВІНЦЫЯ

ЛОНДАН, 21 лістапада.

Гонконгскі карэспандэнт «Таймса» указвае, што, паводле вестак з Амоя (правінцыя Фуцзянь), генерал Цай Тын-кай, камандуючы 19-й арміяй, абвясціў «незалежнай» правінцыю Фуцзянь.

Цай Тын-кай заявіў, што Нанкін не снабжаў грашыма 19-ю армію, і гэта вымусіла яго захапіць даходы Фуцзянскай правінцыі і адмяляючы цэнтральнага банка. У Амоі абвешчана ваеннае становішча.

НОВЫЯ АХВЯРЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

БЕРЛІН, 22 лістапада.

«Франкфуртэр цэйтунг» паведамляе, што ў Ведлінгене (Вюртэмберг) у часе «выбараў» у рэйхстаг на адным з падаўных кандыдацкіх спісаў нацыянал-соцыялістскай партыі былі напісаны «грубейшыя зневажанні на адрасу ўрада». Паводле слоў газеты, калідцы шляхам злічэння печаты устанавіла аўтара гэтых надпісаў і арыштавала яго.

У Гамбургу арыштавана 11 рабочых, якія нібыта з'яўляліся былымі членамі саюза «чырвоных франтавікоў» і прымалі ўдзел у 1930 годзе ў сутычцы з нацыянал-соцыялістамі, у часе якой быў забіт паліцэйскі.

Вольф паведамляе, што ў Радэнфарвальдзе каля Кельна арыштавана 32 чалавекі па падазрэнню ў комуністычнай дзейнасці.

РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ ФРАКЦЫЯ ЛАТВІЙСКАГА СОЙМА ВЫДАНА СУДУ

РЫГА, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Сёння ноччу сойм пастанавіў выдаць суду рабоча-сялянскую фракцыю. Дэпутаты фракцыі сілай выведзены з сойма і арыштаваны.

ДВА ЗАМАХІ НА ВАКАЦУКІ

ТОКІО, 21 лістапада. (БЕЛТА).

Сёння раніцой на лідэра партыі Мінсейто Вакацукі, які вярнуўся з Каназава, зроблен замах членам фашысцкай арганізацыі «Айкокуся» («Асацыяцыя любві да бацькаўшчыны») відомым чэмпіёнам бокса Погуці.

Погуці кінуўся з кулакамі на Вакацукі, але быў абяззброены і арыштован асабістай аховай Вакацукі. На допыце Погуці заявіў, што ён абуран ролай Вакацукі пры заключэнні лондонскай морскай згоды, а таксама за смяротны прыгавор, вынесены гэтымі днямі забойцы Хакагуці (былога прэм'ер-міністра) рэакцыянеру Сагоя. Як відома, рэакцыйныя колы пачнуць вядуць агітацыю за памілаванне Сагоя.

Сёння 23 лістапада ў Доме Комасветы працягваецца чыстка парткалектыва Акадэміі Навук Беларусі.

Персанальную чыстку праходзяць т. т. Домбаль, Сурта, Гурскі.

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВА.

23-га лістапада г. г. ЦК КП(б)Б скліканецца

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА па пытанню

аб вылучэнні і подрыхтоўцы кадраў.

НАРАДА ПАЧНЕЦЦА У 6 ГАДЗ. ВЕЧАРА, У ЗАЛІ ПАСЯДЖЭННЯЎ ЦК.

На нараду выклікаюцца кіраўнікі наркаматаў, цэнтральных гасп-дарчых арганізацый і нач. сектароў кадраў.

ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Беларускі Дзяржаўны тэатр Оперы і балета (памяшканне БДТ—1)

23 і 24 лістапада ОПЕРА

КАРМЕН музыка Бізэ

Рэжысер—Барысовіч Сольга.

Гал. дырыжор—Гіттэрц І. А.

Пачатак роўна ў 8 гадз. веч.

Дзяржаўны кірэйскі тэатр БССР

(вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

Сёння, 23 лістапада

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі Ж. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара.

Білеты, узятыя на 18-11, сапраўдны на 25-11.

Клуб харчавікоў імя Сталіна

23 і 24 лістапада

ВЕЧАРЫ МАСАВАГА ГІПНОЗА КУМБЕРЛЕНА

У праграме вечара:

1) Даклад аб гіпнозе.

2) Сеанс усмлення.

3) Вопыты з усмленымі.

У 3-х аддзяленнях.

Пачатак у 9 г. веч.

Білеты продаюцца ў касе клуба з 12 да 2 г. дня і з 5 г. веч.

Чырвоная зорка — Каса ад 1 г. дня — Вялікі замежны фільм Калі растане снег. У гал. ролі Меры Пікфорд

Кіно „Інтэрнацыянал" — Замежны мастацкі фільм СПРАВА БЛЕРО

„Спартак" — Каса—з 4 г. дня. — Замежны фільм БЕЛАЯ МОЛЬ

Кіно „Пролетарый" — Замежны мастацкі фільм Цыганка Марыцка (грэцкая танцоўшчыца)

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Масавы фільм ФРЫЦ БАЎЭР

25 лістапада г. г., у 12 гадз. дня у памяшканні Галоўнага кіраўніцтва АГМС БССР (Шырокая, 23) адкрываецца

ПЕРШАЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ЗАГАДЧЫКАЎ ГІДРАМЕТСТАНЦЫЙ

сумесна з прадстаўнікамі сельска-гаспадарчых арганізацый чыгуначнага, паветранага і аўтадарожнага транспарта.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1) Даклад начальніка Цэнтральнага кіраўніцтва адзінай гідраметслужбы СССР тав. Вангергента аб задачах гідраметслужбы СССР па абслугоўванню народнай гаспадаркі і абароны краіны.

2) Даклад аб выніках рэарганізацыі АГМС БССР і аб выкананні плана работ 1933 года. (Дакл. тав. Матвеў).

3) Даклад аб плане работ АГМС БССР на 1934 г. (Дакл. тав. Дудкін).

4) Работа секцый.

Просьба да ўсіх запрошаных арганізацый вылучыць сваіх прадстаўнікоў і забяспечыць іх удзел у працы нарады.

Галоўнае кіраўніцтва АГМС БССР.

Белкантора „САЮЗУЦІЛЬ"

даводзіць да ведама дзяржаўных устаноў, грамадзкіх арганізацый, прадпрыемстваў агрэгамаднанага сектара і насельніцтва аб тым, што

ў сувязі з ліквідацыяй АРШАНСКАГА, БАРЫСАЎСКАГА І МАГІЛЁЎСКАГА АДДЗЯЛЕННЯЎ „САЮЗУЦІЛЬ"

усе маючыяся да гэтых аддзяленняў прэтэнзіі павінны быць прад'яўлены ліквідкомам памянёных аддзяленняў „САЮЗУЦІЛЬ" (г. г. Орша, Магілёў і г. Барысаў) да 6-га снежня 1933 г.; пасля гэтага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Белкантора „САЮЗУЦІЛЬ".

Белкантора „САЮЗУЦІЛЬ"

даводзіць да ведама дзяржаўных устаноў, грамадзкіх арганізацый, прадпрыемстваў агрэгамаднанага сектара і насельніцтва аб тым, што

ў сувязі з ЛІКВІДАЦЫЯЙ СЛУЦКАГА І ВІЦЕБСКАГА аддзяленняў „САЮЗУЦІЛЬ",

усе маючыяся да гэтых аддзяленняў прэтэнзіі павінны быць прад'яўлены ліквідкомам памянёных аддзяленняў „САЮЗУЦІЛЬ" (г. г. Слуцк і Віцебск) да 6 снежня 1933 г.; пасля гэтага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Белкантора „САЮЗУЦІЛЬ".

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

2-га снежня 1933 г. склікае

КАНФЕРЭНЦЫЮ

па арганізацыі і складанню адзінага тэматычнага плана навукова-даследчай работы ў галіне сельскай гаспадаркі на 1934 г.

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Тэматычны план навукова-даследчай работы па сельскай гаспадарцы БССР на 1934 г. (дакл. акад. ДОМБАЛЬ).

САДАКЛАДЫ:

а) па збожжавых і кармавых культурах (дырэктар збожжавай станцыі тав. Пранапчук);

б) севазварот і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў (акадэмік Лубяна);

в) па гародніх культурах і бульбе (нам. дырэктара бульбяной станцыі т. Навальчун);

г) па плодагародніх культурах (дырэктар садова-гародняга ін-та т. Лагуценко)

д) лён і тэхкультуры (ст. навуковы працаўнік т. Мяцельскі);

е) ахова раслін (праф. Даронкін);

ж) агратэхніка і хімізацыя сацыялістычнага земляробства (акад. Афанасьеў, праф. Протасоў);

з) па аўладанню балотнымі культурамі (нав. прац. Шушкевіч і Данукін);

і) па механізацыі (праф. Нейо—горацкі ін-т);

к) па жывёлагадоўлі (дац. Фешчанка).

II. Сетка навукова-даследчых устаноў у галіне сельскай гаспадаркі (акадэмік Пэнкевіч).

Канферэнцыя адкрываецца ў залі БелАН (Ленінская, 29-35, другі паверх 2-га снежня, у 12 гадз. дня.

Прэзідыум БелАН.

Ад журы па конкурсу на лепшы драматычны твор.

Даводзіцца да ведама зацікаўленых асоб, што апошні тэрмін 15 снежня здачы п'ес — на Конкурс

г. г. і што да гэтага тэрміна павінен быць прадстаўлен твор (надрукаваны на машынцы або начыста напісаны) па адрасу: Менск, Дзяржмасветы, кіраўніцтва мастацтва, журы конкурса СНК БССР.

Журы конкурса.

БЕЛАРУСКІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ІНСТЫТУТ у Горках абвяшчае студэнцкі набор

на ўсе факультэты інстытута.

Заявы прымаюцца да 25 снежня г. г. Прыёмовыя іспыты—з 25 снежня па 15 студзеня 1934 г.

Аб правілах прыёма гл. газ. „Звязда" ад 10-11-33 г., № 248.

Дырэкцыя.

ШКОЛА ФЗВ пры МАГІЛЁЎСКІМ ШОУКАВІЧ-ЦЫ абвяшчае АСЕННІ НАБОР ВУЧНЯЎ

У школу прымаюцца дзеці: рабочых калгаснікаў, беднякоў і сярэдняцкіх служачых. Узрост 17-18 гадоў.

Адукацыя—6-7 груп сямігодкі. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, сталоўкай і прадуктовымі карткамі па 1-му спісу і ў катэгорыі.

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ—6 м-цаў

Заявы прымаюцца да 1-га снежня 1933 г. Да заяў патрэбна прыкласці дакументы:

1) аб нараджэнні, 2) аб адукацыі, 3) сонстановішчы бацькоў і 4) заверанную анкету.

Адрас: г. Магілёў, Быхаўскае шасэ, барак 4, школа ФЗВ.

Загадчык ФЗВ ДРОЗДОВ.

Дырэкцыя, мясцком і супрацоў